


# ШТО НЕ ДАЗВОЛЕНА — ТОЕ ЗАБАРОНЕНА

## ГРАМАДЗЯНСКУЮ СУПОЛЬНАСЦЬ У БЕЛАРУСІ ПРЫМУШАЮЦЬ СЦІХНУЦЬ

AMNESTY INTERNATIONAL

Amnesty International Publications

Упершыню апублікавана ў 2013 годзе
Amnesty International Publications
International Secretariat
Peter Benenson House
1 Easton Street
London WC1X 0DW
United Kingdom
www.amnesty.org

© Amnesty International Publications 2013

Індэкс: EUR49/002/2013
Мова арыгінала: Англійская.
Надрукавана: Amnesty International, міжнародны сакратарыят, Вялікабрытанія

Усе правы абароненыя. На гэтае выданне распаўсюджваецца аўтарскае права, але яно можа бясплатна перадрукоўвацца любым чынам з мэтамі праваабарончай дзейнасці, барацьбы за правы людзей і дзеля адукацыі, але не на продаж. Уладальнікі аўтарскага права патрабуюць, каб такое выкарыстанне было імі зафіксаванае з мэтай ацэнкі яго ўплыву. Для перадруку з любымі іншымі мэтамі, выкарыстання ў іншых публікацыях, перакладу ці адаптацыі неабходна атрымаць папярэдні пісьмовы дазвол ад выдаўцоў, магчыма, гэта запатрабуе аплаты. Запыты, калі ласка, дасылайце на адрас copyright@amnesty.org.

Фота на вокладцы: супрацоўнікі праваахоўчых органаў фармуюць калідор і збіваюць дэманстрантаў, якія ідуць праз яго ў міліцэйскі фургон 19 снежня 2010 г. © Леанід Варламаў

Amnesty International (Міжнародная Амністыя) – гэта сусветны рух, які аб'ядноўвае больш за 3 мільёны чалавек з больш чым 150 краін і тэрыторый, якія змагаюцца за правы чалавека.

Мы імкнемся да таго, каб кожны чалавек мог карыстацца ўсімі правамі, замацаванымі ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і іншых міжнародных дакументах.

Мы незалежныя ад урадаў, палітычных ідэалогій, эканамічных інтарэсаў ці рэлігій і фінансуемся за кошт ўнёскаў нашых членаў і ахвяраванняў прыхільнікаў.

AMNESTY INTERNATIONAL

# ЗМЕСТ

1. УВОДЗІНЫ ....5

2. МІЖНАРОДНАЕ ПРАВА І СТАНДАРТЫ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА ....7

3. СВАБОДА АСАЦЫЯЦЫЙ ....10

3.1 ПРАЗМЕРНЫЯ АБМЕЖАВАННІ ....11

3.1.1 ПАТРАБАВАННІ ДА АДРАСУ АРГАНІЗАЦЫІ ....12

3.1.2 АБМЕЖАВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ НДА ....14

3.1.3 ДОСТУП ДА ФІНАНСАВАННЯ ....14

3.2 КРЫМІНАЛЬНЫ ПЕРАСЛЕД НЕЗАРЭГІСТРАВАНЫХ НДА ....15

3.3 НЕАБХОДНАСЦЬ ДЗЯРЖАЎНАЙ АЎТАРЫЗАЦЫІ – ГНЯТЛІВАЯ І ЦЯЖКАЯ ПРАЦЭДУРА ....16

3.4 ЗАКРЫЦЦЁ І СПЫНЕННЕ ДЗЕЙНАСЦІ НДА ....19

4. СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ ....22

4.1 ЗАРЭГУЛЯВАНАСЦЬ: ШТО НЕ ДАЗВОЛЕНА – ТОЕ ЗАБАРОНЕНА ....22

4.2 НЕАБХОДНАСЦЬ АТРЫМАЦЬ ДАЗВОЛ ....23

4.3 СПАНТАННЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ....24

4.4 АДМІНІСТРАЦЫЙНЫ ПЕРАСЛЕД ....25

4.4.1 ЦІСК НА АКТЫВІСТАЎ ....25

4.4.2 АДМІНІСТРАЦЫЙНЫ ПЕРАСЛЕД ЗА ПРАВЯДЗЕННЕ НЕСАНКЦЫЯНАВАНЫХ МІТЫНГАЎ ....25

4.5 ГВАЛТОЎНЫ РАЗГОН – ПАДЗЕІ СНЕЖНЯ 2010 ГОДА ....27

4.6 ПАЛІТЫЧНА МАТЫВАВАНЫ КРЫМІНАЛЬНЫ ПЕРАСЛЕД ....31

5. ПРАВААБАРОНЦЫ ....33

5.1 КРЫМІНАЛЬНЫ ПЕРАСЛЕД ....34

5.2 УЦІСК ... 36
5.2.1 ПАДАТКОВЫЯ ПАТРАБАВАННІ ... 36
5.2.2 АБМЕЖАВАННЕ ПАЕЗДАК ... 37
6. НЕЗАЛЕЖНЫЯ ПРАФСАЮЗЫ ... 39
6.1 ЦЯЖКАСЦЬ РЭГІСТРАЦЫІ ... 41
6.2 ДЫСКРЫМІНАЦЫЯ ЧЛЕНАЎ ПРАФСАЮЗА ... 41
7. ЭКАЛАГІЧНЫЯ АКТЫВІСТЫ ... 44
7.1 АСТРАВЕЦКАЯ АЭС ... 45
7.1.1 АДМІНІСТРАЦЫЙНЫЯ ЗАТРЫМАННІ ... 46
7.1.2 АБМЕЖАВАННІ НА СВАБОДУ ПЕРАМЯШЧЭННЯ Ў ЕЎРАПЕЙСКІ САЮЗ... 47
8. ЛГБТ-ГРУПЫ ... 49
8.1 АБМЕЖАВАННЕ СВАБОДЫ МІРНЫХ СХОДАЎ ... 49
8.2 АБМЕЖАВАННЕ СВАБОДЫ АСАЦЫЯЦЫЙ – АДМОВА Ў РЭГІСТРАЦЫІ ЛГБТ-АРГАНІЗАЦЫІ ... 50
9. ВЫСНОВЫ І РЭКАМЕНДАЦЫІ ... 54
9.1 БЕЛАРУСКІМ УЛАДАМ ... 54
9.2 ДА МІЖНАРОДНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ ... 56
ЗНОСКІ ... 57

# 1. УВОДЗІНЫ

У гэтым дакладзе "Міжнародная Амністыя" аглядае стан правоў на свабоду мірных сходаў і асацыяцый у Беларусі. Гэтыя правы разам са свабодай выказвання з'яўляюцца асновай існавання грамадзянскай супольнасці, таму што яны даюць людзям магчымасць выказваць свае палітычныя погляды, удзельнічаць у культурным жыцці, спавядаць сваю рэлігію ці іншыя перакананні і прадстаўляць свае інтарэсы ва ўзаемадзеянні з іншымі.

Развітая грамадзянская супольнасць з'яўляецца важным удзельнікам фармавання палітыкі і фактарам гарантыі адказнасці ўрада.

Беларускія грамадзянскія актывісты, якія хочуць публічна выказаць свае прапановы, мусяць дзейнічаць у вузкіх рамках абмежавальных законаў, якія выкарыстоўваюцца такім чынам, што парушаюць свабоду мірных сходаў, асацыяцый і выказвання. Грамадскія аб'яднанні закрываюцца, а актывісты церпяць пераслед, калі крытыкуюць уладу. Любая форма публічных мерапрыемстваў – нават пікет аднаго чалавека – патрабуе дазволу, які, аднак, даецца вельмі рэдка. Таму мірныя дэманстранты атрымліваюць штрафы ці арышты.

Абмежаванне свабоды мірных сходаў у Беларусі прыцягнула сусветную ўвагу ў снежні 2010 года, калі відавочна мірная дэманстрацыя па завяршэнні прэзідэнцкіх выбараў была жорстка разагнаная праваахоўнікамі. Сотні дэманстрантаў былі збітыя, адвольна затрыманыя і асуджаныя агулам. Усе асноўныя апазіцыйныя кандыдаты ў прэзідэнты і іншыя выбітныя апазіцыйныя актывісты былі зняволеныя. Мікола Статкевіч, Павал Севярынец, Эдуард Лобаў і Зміцер Дашкевіч застаюцца ў няволі дагэтуль. Высокі кошт мае званне праваабаронцы – гэта бачна са справы Алеся Бяляцкага, старшыні праваабарончага цэнтра "Вясна", якога 24 лістапада 2011 года асудзілі да чатырох з паловай гадоў турмы па абвінавачваннях ва ўхіленні ад выплаты падаткаў з грошай, якія паступалі на яго рахункі ў Польшчы і Літве дзеля фінансавання дзейнасці праваабарончага цэнтра "Вясна", які не можа адкрыць банкаўскі рахунак у Беларусі.

Яшчэ больш праваабаронцаў, палітычных і грамадскіх актывістаў і асацыяцый сутыкаюцца з пастаяннымі бюракратычнымі цяжкасцямі, уціскам і пераследам па больш лёгкіх абвінавачваннях. Пры падрыхтоўцы гэтага даклада "Міжнародная Амністыя" сустракалася з шырокім колам арганізацый і людзей. Сярод іх дабрачынныя аб'яднанні, якія дапамагаюць сем'ям з прыёмнымі дзецьмі, этнічным меншасцям ды іншым сацыяльным групам; экалагічныя актывісты і абаронцы правоў працоўных; тыя, хто дапамагае ахвярам пытак і іншых парушэнняў правоў чалавека ці спрыяе разуменню грамадства з дапамогай тэатру. І калі адны хочуць палітычных зменаў і лічаць сябе апазіцыяй да дзейнай улады, то іншыя жадаюць працаваць з уладамі, каб палепшыць сітуацыю ў краіне. Аднак з тымі, хто выказвае альтэрнатыўныя ўрадавым погляды, часта абыходзяцца, як з ворагамі дзяржавы. Як сказаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы па развіцці прадпрымальніцтва ў Мінску ў лютым 2013 года, перасцярагаючы бізнесменаў ад фінансавання палітычных партый, "калі хтосьці з бізнесменаў будзе фінансаваць "пятую калону" ці нейкім іншым спосабам аказваць

негатыўны ўплыў на грамадства, то я буду лічыць, што яны ўключыліся ў палітычную барацьбу, у барацьбу супраць дзяржавы”.[1]

## БЕЛАРУСЬ

Насельніцтва краіны складае каля 9 500 000 чалавек. Беларусь стала незалежнай ад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР) у 1991 годзе. Аляксандр Лукашэнка з’яўляецца Прэзідэнтам Беларусі з 1994 і з таго часу ўзмацніў прэзідэнцкі кантроль над усімі сферамі грамадства. У 1996 годзе змены ў Канстытуцыі ўзмацнілі прэзідэнцкую ўладу і аслабілі парламент, а ў 1999 годзе прэзідэнцкі дэкрэт змяніў умовы працы на дзяржаўных прадпрыемствах (дзе задзейнічаны каля 90% працоўных) і перавёў усіх на часовыя кантракты. Зневажанне правоў чалавека уключна з парушэннем права на свабоду выказвання, мірных сходаў і асацыяцый прывяло да міжнароднага ганьбавання і ізаляцыі краіны. Беларусь не ўваходзіць у склад Савета Еўропы, і яе статус спецыяльна запрошанага быў спынены ў 1997 годзе пасля [як паведамлялася] несправядлівых выбараў. Беларусь з’яўляецца апошняй краінай у Еўропе і Цэнтральнай Азіі, дзе дагэтуль ужываецца смяротнае пакаранне за “наўмыснае забойства з абцяжарваючымі абставінамі” і за 12 іншых злачынстваў у мірны час.

У розных частках былога Савецкага Саюза грамадзянская супольнасць знаходзіцца на розных узроўнях развіцця і змагаецца за адмову ад савецкай спадчыны татальнага дзяржаўнага кантролю, і некаторыя ўрады робяць захады па ўключэнні грамадзянскай супольнасці ў працэсы выпрацоўкі палітыкі[2]. Аднак у Беларусі ўрад спрабуе ўзяць грамадзянскую супольнасць пад кантроль пры дапамозе рэпрэсіўнага заканадаўства і пагрозаў санкцый і пераследу.

У прадстаўленым дакладзе аналізуецца заканадаўства, якое рэгулюе свабоду мірных сходаў і асацыяцый у Беларусі, і прыведзены факты парушэння гэтых правоў у дачыненні да праваабаронцаў, прафсаюзных і экалагічных актывістаў, а таксама лезбіянак, геяў, бісексуалаў і трансгендэраў.

“Міжнародная Амністыя” выкарыстоўвае ў гэтым дакладзе тэрмін “недзяржаўныя арганізацыі” (НДА), ці няўрадавыя арганізацыі, у дачыненні да ўсіх груп грамадзянскай супольнасці, уключна з прафесійнымі саюзамі, хаця ў адпаведнасці з беларускім заканадаўства НДА могуць рэгістравацца як асацыяцыі, установы ці фонды. Звычайна палітычныя партыі не падпадаюць пад вызначэнне НДА, але сітуацыя ў Беларусі з’яўляецца анамальнай, таму што з-за празмерных патрабаванняў да рэгістрацыі палітычных партый апазіцыйныя партыі вырашылі зарэгістравацца ў якасці НДА.

У гэтым дакладзе апісваюцца парушэнні права на свабоду выказвання, мірных сходаў і асацыяцый, а таксама іншыя парушэнні правоў чалавека, з якімі ў Беларусі сутыкнуліся людзі, што спрабавалі працаваць на карысць грамадства – асобна ці як члены НДА. Акрамя таго, у дакладзе прыводзяцца рэкамендацыі па зменах заканадаўства і практыкі, накіраваныя на прывядзенне іх у адпаведнасць з міжнароднымі нормамі і стандартамі ў сферы правоў чалавека, у прыватнасці, у дачыненні да забеспячэння права на свабоду мірных сходаў і асацыяцый. “Міжнародная Амністыя” спадзяецца, што гэтыя рэкамендацыі прынясуць карысць грамадзянскай супольнасці ў Беларусі.

# 2. МІЖНАРОДНАЕ ПРАВА І СТАНДАРТЫ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

Правы на свабоду мірных сходаў і асацыяцый замацаваныя ў артыкуле 20 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і гарантаваныя Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах (МПГПП). Як краіна-ўдзельнік МПГПП, Беларусь узяла на сябе юрыдычныя абавязацельствы паважаць правы, пералічаныя ў дамове, і гарантаваць, што кожны чалавек на яе тэрыторыі і пад яе юрысдыкцыяй можа карыстацца гэтымі правамі. У 2010 годзе Савет ААН па правах чалавека прызначыў Спецыяльнага дакладчыка па правах на свабоду мірных сходаў і асацыяцый з мэтамі маніторынгу выканання краінамі сваіх абавязацельстваў у дачыненні да гэтых правоў і для напісання даклада аб парушэннях, калі яны дзесьці адбываюцца.

Міжнароднае права правоў чалавека накладае на дзяржавы абавязак паважаць і абараняць правы ўсіх асоб на мірныя сходы і асацыяцыі без непатрэбных абмежаванняў, “у тым ліку ў кантэксце выбараў, а таксама ўключаючы асобаў, якія падтрымліваюць меншасці ці асаблівыя погляды ці перакананні, праваабаронцаў, прафсаюзных актывістаў і іншых, уключна з мігрантамі”.[3] Спецыяльны дакладчык ААН па правах на свабоду мірных сходаў і асацыяцый адзначыў, што гэтыя правы даступныя і незарэгістраваным, і зарэгістраваным асацыяцыям.[4]

Абавязацельствы дзяржаў гарантаваць гэтыя і іншыя правы чалавека цягнуць за сабой абавязак забяспечыць, каб усе афіцыйныя асобы паважалі тыя правы, а таксама забяспечыць абарону асоб ад любых дзеянняў з боку іншых асоб ці інстытуцый, якія б перашкаджалі выкарыстанню гэтых правоў. Дзяржавы мусяць таксама забяспечыць даступныя і эфектыўныя сродкі прававой абароны, уключаючы адпаведныя адміністрацыйныя і судовыя механізмы, датычна любога парушэння правоў чалавека, і таксама мусяць забяспечыць агульную адпаведнасць нацыянальнага заканадаўства і практыкі міжнароднаму праву ў галіне правоў чалавека.[5]

Міжнародныя стандарты дазваляюць дзяржавам накладаць пэўныя абмежаванні на карыстанне правамі на свабоду мірных сходаў і асацыяцый і свабоду выказвання, але любыя такія абмежаванні дапускаюцца толькі калі яны адпавядаюць усім тром наступным крытэрыям:

1) яны павінны ўводзіцца законам; гэта азначае, што закон мусіць быць даступны і сфармуляваны з дастатковай дакладнасцю, каб даць магчымасць асобе рэгуляваць свае паводзіны належным чынам;

2) яны мусяць існаваць толькі для адной з легітымных мэтаў, пазначаных у міжнародным праве, а менавіта абароны пэўных грамадскіх інтарэсаў

(нацыянальнай ці грамадскай бяспекі, грамадскага парадку (ordre public), грамадскага здароўя ці маралі) ці правоў і свабод іншых асоб;

3) яны павінны быць неабходнымі для дасягнення мэты, то бок, быць сродкамі як мага меншага ўмяшальніцтва для дасягнення мэты і павінны адпавядаць прынцыпу суразмернасці.

У гэтай сувязі Камітэт ААН па правах чалавека – орган незалежных экспертаў, створаны ў адпаведнасці з МПГПП, каб кантраляваць выкананне дамовы дзяржавамі, – падкрэсліў, што "калі ўводзяцца такія абмежаванні, дзяржавы павінны паказаць іх неабходнасць і прыняць толькі такія меры, якія з'яўляюцца прапарцыйнымі для дасягнення легітымных мэтаў, каб забяспечыць бесперапынную і эфектыўную абарону правоў, пазначаных у Пакце. Ні ў якім выпадку абмежаванні не могуць прымяняцца або ажыццяўляцца такім чынам, каб гэта парушала сутнасць замацаваных у Пакце правоў"[6] і "прымаючы законы, якія прадугледжваюць абмежаванні ... дзяржавам варта заўсёды кіравацца прынцыпам, што абмежаванні не павінны ўшчамляць сутнасць права … суадносіны паміж правам і абмежаваннем, паміж нормай і выключэннем не павінны быць перавернутымі".[7]

Што тычыцца адпаведнасці абмежаванняў крытэрыю неабходнасці, Спецыяльны дакладчык ААН падкрэсліў, што мусіць быць "неабходная сацыяльная патрэба" дзеля любога ўмяшальніцтва дзяржавы. Гэта таксама падкрэсліла Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) ў сваіх Кіруючых прынцыпах па свабодзе мірных сходаў[8] і свабодзе асацыяцый[9]. Гэтыя стандарты таксама прымяніў Еўрапейскі суд па правах чалавека.[10]

Што тычыцца права на свабоду выказвання, Камітэт ААН па правах чалавека адзначыў, што яно ахоплівае нават выказванне, якое можа разглядацца як глыбока абразлівае[11]; падобным чынам Еўрапейскі суд па правах чалавека неаднаразова пастанаўляў, што гэтае права тычыцца не толькі "інфармацыі і ідэй, якія добразычліва прымаюцца альбо расцэньваюцца як бяскрыўдныя альбо абыякавыя, але таксама і да тых, якія абражаюць, шакуюць ці выклікаюць занепакоенасць у дзяржавы або якой-небудзь часткі насельніцтва".[12] Гэта патрабуе ад дзяржаў праяўлення памяркоўнасці, адкрытасці і павагі да плюралізму:

> *"Гэта патрабаванні плюралізму, талерантнасці і адкрытасці, без якіх не існуе "дэмакратычнага грамадства". Гэта азначае, сярод іншага, што кожная "фармальнасць", "умова", "абмежаванне" ці "санкцыя" ў гэтай сферы павінны быць прапарцыйныя пастаўленай легітымнай мэце".*[13]

Права на свабоду выказвання ўключае права шукаць і атрымліваць інфармацыю і ідэі ды распаўсюджваць іх. Камітэт па правах чалавека адзначыў, што гэта ўключае ў сябе права на доступ да інфармацыі, якая знаходзіцца ў падпарадкаванні дзяржаўных органаў (у тым ліку недзяржаўных суб'ектаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўныя функцыі), і патрабуе, каб дзяржавы актыўна рабілі публічнай урадавую інфармацыю, якая мае грамадскі інтарэс, і забяспечвалі да яе доступ, стваралі працэдуры для атрымання доступу да інфармацыі, напрыклад, з дапамогай заканадаўства аб свабодзе

інфармацыі.[14] У Беларусі гэта мае асаблівае значэнне для экалагічных актывістаў (гл. стар 44-48).

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь гарантуе “свабоду сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў, дэманстрацый і пікетавання, якія не парушаюць правапарадак і правы іншых грамадзян Рэспублікі Беларусь” (артыкул 35), а таксама права на свабоду асацыяцый (артыкул 36). Аднак насамрэч гэтыя правы абмежаваныя рэпрэсіўным заканадаўствам, указамі Прэзідэнта, а інтэрпрэтацыя гэтых законаў і ўказаў чыноўнікамі і суддзямі яшчэ больш жорсткая. У апошнія гады пры разглядзе шэрагу петыцый з Беларусі, у якіх былі знойдзены факты парушэнняў права на свабоду мірных сходаў і асацыяцый, Камітэт ААН па правах чалавека адзначыў, што нават калі абмежаванні на правы былі заснаваныя па законе, улады не змаглі прадэманстраваць, што яны былі неабходныя для адной з легітымных мэтаў, выкладзеных у Пакце. Нацыянальнае заканадаўства і практыка ў гэтай галіне не сумяшчальныя з абавязацельствамі Беларусі ў адпаведнасці з міжнародным правам правоў чалавека, і сотні людзей у Беларусі кожны год пазбаўляюцца сваіх правоў на свабоду сходаў і аб’яднанняў.

# 3. СВАБОДА АСАЦЫЯЦЫЙ

У Беларусі існуе шэраг законаў, якія тычацца асобных відаў арганізацый і ўтрымліваюць падрабязныя правілы іх функцыянавання:

- Закон Рэспублікі Беларусь аб палітычных партыях;
- Закон Рэспублікі Беларусь аб прафсаюзах;
- Закон Рэспублікі Беларусь аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях;
- Закон Рэспублікі Беларусь аб грамадскіх аб'яднаннях.

Няўрадавыя арганізацыі ў Беларусі можна зарэгістраваць у якасці фонда, установы альбо грамадскага аб'яднання. Грамадскія аб'яднанні і фонды рэгіструюцца ў Міністэрстве юстыцыі ці ў яго тэрытарыяльных аддзяленнях, а ўстановы – у мясцовых органах улады ў розных рэгіёнах краіны, якія могуць дэлегаваць задачы гораду ці раённай уладзе. Палітычныя партыі рэгіструюцца ў Міністэрстве юстыцыі, прафсаюзы – у мясцовых органах улады.

Некаторыя НДА вырашылі зарэгістравацца ў якасці ўстаноў альбо фондаў, таму што рэгістрацыйныя патрабаванні менш строгія, чым для грамадскага аб'яднання. Рэгістрацыя ў якасці грамадскага аб'яднання дае больш магчымасцей для НДА, бо яны могуць мець членства і збіраць членскія ўзносы, але разам з тым яны з'яўляюцца прадметам больш пільнага кантролю з боку дзяржавы і павінны атрымаць дазвол на рэгістрацыю. Установам дастаткова паведаміць дзяржаве аб сваім існаванні, але неабходна зарэгістраваць імя, і гэта можа апынуцца складаным, як паказвае прыклад арганізацыі "Платформа" (гл. с. 20-21).

У 2012 годзе ў Беларусі было на ўліку 2477 аб'яднанняў, 15 палітычных партый, 37 прафсаюзаў[15]; за год зарэгістравана 111 новых аб'яднанняў, 56 з іх – спартыўныя. Па дадзеных "Цэнтра прававой трансфармацыі" – НДА, якая сочыць за свабодай аб'яднанняў у Беларусі – гэтыя лічбы гавораць пра схільнасць рэгіструючых органаў да асобных відаў аб'яднанняў: сярод 111 зарэгістраваных аб'яднанняў ніводнае не было актыўным у вобласці правоў жанчын, гендэрнай роўнасці, правоў чалавека альбо любога іншага аспекту дэмакратычных пераўтварэнняў.[16] На сённяшні дзень існуе толькі адно зарэгістраванае рэспубліканскае аб'яднанне па правах чалавека – Беларускі Хельсінкскі камітэт. Аднак ёсць шэраг мясцовых НДА і ўстаноў па правах чалавека, такіх як "Цэнтр прававой трансфармацыі".

Закон аб грамадскіх аб'яднаннях прадугледжвае тры формы санкцый для аб'яднанняў, якія парушаюць свае статуты ці палажэнні закона: пісьмовае папярэджанне, прыпыненне або ліквідацыя. Прыпыненне ці ліквідацыя могуць з'явіцца пасля аднаго альбо некалькіх папярэджанняў і могуць быць выкліканыя парушэннямі, якія нельга выправіць. Акрамя таго, існуе цэлы шэраг прэзідэнцкіх указаў, якія маюць прыярытэт над парламенцкім заканадаўствам і ўводзяць дадатковыя патрабаванні да працы няўрадавых арганізацый усіх відаў. У жніўні 2012 года праект Закона "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях дзейнасці палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў" быў прадстаўлены ў Палату прадстаўнікоў і на момант напісання гэтага тэксту яшчэ абмяркоўваецца.

Законапраект крыху спрашчае працэдуры рэгістрацыі, але не істотна паляпшае сітуацыю з правамі на свабоду аб’яднанняў. Прапановы ад “Цэнтра прававой трансфармацыі” былі адхіленыя Палатай прадстаўнікоў у сакавіку 2013 года.

## 3.1 ПРАЗМЕРНЫЯ АБМЕЖАВАННІ

У адпаведнасці з артыкулам 22 МПГПП, дзяржавы не могуць уносіць любыя абмежаванні на ажыццяўленне права на свабоду аб’яднанняў, калі толькі такія абмежаванні не прадугледжаныя законам і з’яўляюцца “неабходнымі ў дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах дзяржаўнай ці грамадскай бяспекі, грамадскага парадку (грамадзянскага парадку), аховы здароўя насельніцтва або маральнасці ці абароны правоў і свабод іншых асоб”.

Патрабаванні да НДА у Беларусі могуць быць надзвычай строгімі, што можа стаць прычынай адмовы ў рэгістрацыі ці нават ліквідацыі арганізацыі з-за іх невыканання. Такія патрабаванні, што прад’яўляюцца да НДА, а таксама пагроза закрыцця ў выніку іх невыканання, не адпавядаюць крытэрыям неабходнасці легітымнай мэты ў міжнародным праве правоў чалавека.

## БЕЛАРУСКАЯ ХРЫСЦІЯНСКА-ДЭМАКРАТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ

**Адзін з лідараў Беларускай хрысціянска-дэмакратычнай партыі (БХД) Павел Севярынец на сённяшні дзень адбывае пакаранне ў выглядзе трох гадоў пазбаўлення волі ў папраўчай установе адкрытага тыпу за ўдзел у галоўным чынам мірнай дэманстрацыі 19 снежня 2010 года.**

Пачынаючы з 2007 года, партыя пяць разоў спрабавала зарэгістравацца, і ў кожным выпадку ёй было адмоўлена. Напрыклад, у 2007 годзе заяўка была адхіленая Міністэрствам юстыцыі на падставе таго, што яна “парушыла закон аб грамадскіх аб’яднаннях”, таму што ў ёй было пазвачана, што члены павінны быць “прыхільнікамі хрысціянскага светапогляду”. Спробы зарэгістравацца ў 2009, 2010, 2011 і 2012 гадах былі таксама адхілены з-за пярэчанняў супраць некаторых асоб з ліку заснавальнікаў. На многіх заснавальнікаў аказваўся ціск, каб яны адклікалі свае подпісы, ім пагражалі. Напрыклад, праз дзевяць дзён пасля ўстаноўчага сходу 17 снежня 2011 года Анастасія Мацак, член арганізацыйнага камітэта партыі, якая працуе ў дзіцячым садку ў Нараўлянах Гомельскага раёна, была выклікана ў мясцовы камітэт па адукацыі. Ёй паказалі файл, прысланы з Міністэрства юстыцыі, і паведамілі, што калі яна не пакіне арганізацыйны камітэт партыі, то кантракт з ёю не будзе працягнуты (як і ўсе дзяржаўныя служачыя, яна працуе на кантрактнай аснове). Членам партыі таксама пагражалі крымінальным пераследам у адпаведнасці з артыкулам 193-1 Крымінальнага кодэкса за дзеянні ад імя незарэгістраванай арганізацыі. 22 кастрычніка 2012 года Алег Аксёнаў, каардынатар партыі ў Магілёве, даведаўся, што яго змясцілі ў спіс адмысловага кантролю Камітэта дзяржаўнай бяспекі (КДБ) пры магчымым парушэнні артыкула 193-1. На сённяшні дзень ніхто не быў прыцягнуты да адказнасці. Тым не менш, як сказаў член партыі арганізацыі “Міжнародная Амністыя”: “Адсутнасць прававога статусу, аднак, не з’яўляецца перашкодай БХД для арганізацыі і развіцця партыйных структур і выпрацоўкі палітычных кампаній. Хоць дзеянне ад

імя незарэгістраванай арганізацыі з’яўляецца злачынствам у Беларусі, якое можа быць пакарана двума гадамі турмы па артыкуле 193-1 Крымінальнага кодэкса, нашы актывісты павінны прымаць сур’ёзнае рашэнне пры ўступленні ў партыю”.[17]

У студзені 1999 года быў прыняты Дэкрэт Прэзідэнта № 2 “Аб некаторых мерах па ўпарадкаванні дзейнасці палітычных партый, прафесійных асацыяцый і іншых грамадскіх аб’яднанняў”. Гэты дэкрэт уключаў патрабаванне перарэгістравацца ўсім НДА, і тыя, што не прайшлі гэту працэдуру, былі зліквідаваныя. У выніку знікла вялікая колькасць няўрадавых арганізацый. Дэкрэт зрабіў больш жорсткімі патрабаванні па рэгістрацыі для палітычных партый (мінімум 1000 членаў, па меншай меры, з паловы раёнаў у краіне) і ўвёў патрабаванне юрыдычнага адрасу для рэгістрацыі прафсаюза. Ён таксама прапанаваў увесці змены ў заканадаўства, каб забараніць дзейнасць незарэгістраваных арганізацый і ўвесці адміністрацыйныя штрафы і перыяды кароткага ўтрымання пад вартай асоб (адміністрацыйны арышт), якія дзейнічаюць ад імя незарэгістраваных арганізацый.[18]

З 2000 года ў Беларусі не было зарэгістравана новых палітычных партый. На сайце Міністэрства юстыцыі ёсць спіс з 15 палітычных партый, зарэгістраваных у Беларусі. Усе яны былі зарэгістраваны да 1999 года, а пасля перарэгістраваны ў 1999 і 2000 гадах у адпаведнасці з патрабаваннямі Дэкрэта Прэзідэнта ад 1999 года.[19] Улічваючы цяжкасці рэгістрацыі ў якасці палітычнай партыі, а таксама рызыкі судовага пераследу за дзеянні ад імя незарэгістраванай партыі, палітычныя партыі дамагаюцца рэгістрацыі ў якасці грамадскага аб’яднанні ці ўстановы, але нават у гэтым выпадку многія адчуваюць цяжкасці ў рэгістрацыі. Палітычныя партыі, якія зарэгістраваны як НДА, могуць выстаўляць толькі асобных, а не партыйных кандыдатаў. Калі ж яны наогул не змогуць зарэгістравацца, то могуць сутыкнуцца з пераследам за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

### 3.1.1 ПАТРАБАВАННІ ДА АДРАСУ АРГАНІЗАЦЫІ

З 2005 года Жыллёвы кодэкс, а таксама дэкрэт Прэзідэнта № 2 ад 1999 года патрабуюць, каб палітычныя партыі, прафсаюзы і грамадскія аб’яднанні былі размешчаныя ў працоўных, а не жылых памяшканнях. Для рэгістрацыі аб’яднання або прафсаюза заснавальнікі павінны падаць натарыяльна завераны гарантыйны ліст ад арэндадаўцы і пасведчанне аб праве валодання памяшканнямі арэндадаўцам.

“Міжнародная Амністыя” прызнае, што ўраду, магчыма, спатрэбіцца рэгуляванне выкарыстання зямлі і маёмасці для аховы грамадскага здароўя, горадабудаўніцтва альбо па іншых прычынах. Тым не менш, у сітуацыі, калі дзяржава можа ціснуць на прыватных домаўладальнікаў, каб тыя не прадастаўлялі памяшканні, гэта патрабаванне можа ўяўляць з сябе перашкоду для свабоды асацыяцый.

Пошук грамадскіх або працоўных памяшканняў асабліва складаны для НДА у рэгіёнах, гэта накладае дадатковыя выдаткі. Акрамя таго, НДА, і асабліва незалежныя прафсаюзы, якія адмовіліся ад памяшканняў з боку працадаўцаў, лічаць, што на прыватных ўладальнікаў ціснуць мясцовыя ўлады ці іншыя афіцыйныя органы і прымушаюць іх не здаваць памяшканні ў арэнду. Адсутнасць магчымасці атрымаць юрыдычны адрас з’яўляецца частай прычынай для адмовы ў рэгістрацыі арганізацыі. Гнуткае ўжыванне гэтага патрабавання, напрыклад, гатоўнасць ўлады прыняць адрас

пражывання для рэгістрацыі невялікіх арганізацый грамадзянскай супольнасці, і адмена патрабавання падаваць натарыяльна завераны гарантыйны ліст ад арэндадаўцы могуць скасаваць некаторыя перашкоды да ажыццяўлення права на свабоду аасацыяцый.

## КАМПАНІЯ “ГАВАРЫ ПРАЎДУ”

**Гэты палітычны рух быў зарэгістраваны ў якасці ўстановы ў студзені 2009 года пад назвай “Рух наперад”. Тым не менш, установа была зачынена ў верасні 2010 года напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў на той падставе, што яна выкарыстоўвала камерцыйныя, а не офісныя памяшканні ў якасці юрыдычнага адрасу, і такім чынам выкарыстоўвала іх для мэт, для якіх яны не прызначаны.**

З таго часу кампанія тры разы спрабавала зарэгістравацца ў якасці грамадскай арганізацыі, кожны раз у гэтым было адмоўлена Міністэрствам юстыцыі. У жніўні 2011 года руху, зарэгістраванаму пад назвай “Гавары праўду”, было адмоўлена ў рэгістрацыі ў якасці грамадскага аб’яднання на той падставе, што: а) яны не прадставілі дакументы, якія пацвярджаюць, што асоба, якая дала гарантыйны ліст на юрыдычны адрас, сапраўды з’яўляецца ўладальнікам гэтага памяшкання, б) гарантыйны ліст быў накіраваны на імя аб’яднання, а не Міністэрства юстыцыі, і в) мелі месца разыходжанні паміж датай нараджэння ў гарантыйным лісце і ў даверанасці на асобу, якая прадастаўляе гарантыйны ліст.

Заснавальнікі руху абскардзілі адмову ў рэгістрацыі на той падставе, што парушэнні, якія былі названы ў якасці прычын для адмовы ў рэгістрацыі, не былі незваротнымі і маглі быць выпраўленыя. Яны спасылаліся на артыкул 15 Закона аб грамадскіх аб’яднаннях, у якім гаворыцца, што грамадскія аб’яднанні могуць быць закрытыя толькі за парушэнні, якія з’яўляюцца незваротнымі.

19 кастрычніка 2011 года Вярхоўны Суд пастанавіў, што парушэнні былі незваротнымі і падтрымаў рашэнне Міністэрства юстыцыі аб адмове ў рэгістрацыі.

У студзені і лютым 2012 года працаўнікі гранітнага кар’ера “Граніт” у Мікашэвічах няўдала спрабавалі атрымаць юрыдычны адрас для рэгістрацыі незалежнага прафсаюза. Працадаўца, а таксама органы мясцовага самакіравання адмовіліся даць памяшканне. Мясцовыя арэндадаўцы таксама адмовіліся, заявіўшы, што яны павінны “карміць сваіх дзяцей” (гл. с. 39-43).

У 2012 годзе Камітэт па свабодзе аб’яднанняў Міжнароднай арганізацыі працы заклікаў беларускі ўрад унесці папраўкі ў Дэкрэт Прэзідэнта № 2 ад 1999 года, каб патрабаванне аб юрыдычным адрасе не было перашкодай для рэгістрацыі прафсаюзаў.[20]

“Міжнародная Амністыя” заклікае беларускія ўлады змяніць патрабаванні для НДА датычна юрыдычнага адраса, каб ім не маглі адмовіць у рэгістрацыі па прычыне немагчымасці яго атрымаць.

### 3.1.2 АБМЕЖАВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ НДА

З верасня 2011 года Закон аб адукацыі выключыў НДА са спісу арганізацый, якія ўпаўнаважаны праводзіць навучанне дарослых, такое як навучальныя курсы, семінары і самаўдасканаленне дзейнасці. Закон не рэгулюе пытанні ажыццяўлення такой дзейнасці НДА, але ўлада працуе на прынцыпе забароны таго, што канкрэтна не дазволена. У сваім дакладзе аб свабодзе аб'яднанняў у 2012 годзе "Цэнтр прававой трансфармацыі" выказаў занепакоенасць новай трывожнай тэндэнцый адмовіць у рэгістрацыі на той падставе, што НДА парушаюць Закон аб адукацыі.[21] У снежні 2011 года НДА "Літвіны", якая прадстаўляе інтарэсы этнічных груп, было адмоўлена ў рэгістрацыі на той падставе, што ў ліку яе дзейнасці прысутнічаюць навучальныя курсы.

Патрабаванне, каб пэўныя віды дзейнасці, такія як навучанне або прафесійная падрыхтоўка, ажыццяўляліся толькі людзьмі з адпаведнымі навыкамі і кваліфікацыяй, можа быць законным. Аднак такія правілы не павінны выкарыстоўвацца ў якасці сродку адмовы ў рэгістрацыі НДА ці іншым чынам перашкаджаць ажыццяўленню права на свабоду аб'яднанняў.

### 3.1.3 ДОСТУП ДА ФІНАНСАВАННЯ

Арганізацыі грамадзянскай супольнасці павінны мець права на пошук і забеспячэнне фінансавання і рэсурсаў ад унутраных, замежных і міжнародных арганізацый. Спецыяльны дакладчык ААН па правах на свабоду мірных сходаў і аб'яднанняў падкрэсліў, што здольнасць аб'яднанняў мець доступ да фінансавання і рэсурсаў з'яўляецца неад'емнай і важнай часткай права на свабоду аб'яднанняў, і што любыя аб'яднанні, як зарэгістраваныя, так і незарэгістраваныя, павінны мець права запытваць і забяспечваць фінансаванне і рэсурсы ад унутраных, замежных і міжнародных арганізацый, у тым ліку ад прыватных асоб, прадпрыемстваў, арганізацый грамадзянскай супольнасці, урадаў і міжнародных арганізацый. Нягледзячы на тое, што могуць існаваць пэўныя правілы адносна замежных датацый для палітычных партый, каб пазбегнуць празмернага ўплыву замежных інтарэсаў на ўнутраныя палітычныя справы, аб'яднанні ў цэлым павінны мець доступ да замежнага фінансавання. Пры гэтым пытанні, кшталту адмывання грошай, за вырашэнне якіх адказвае дзяржава, павінны рэгулявацца з дапамогай іншых механізмаў, напрыклад, банкаўскімі законамі ці законамі аб празрыстасці бухгалтарскага ўліку. Дзяржава не павінна звяртацца да падатковага ціску, каб перашкаджаць аб'яднанням пры атрыманні сродкаў.[22]

За апошняе дзесяцігоддзе ў Беларусі назіраюцца паўторныя папраўкі ў законы, каб узмацніць дзяржаўны кантроль над дзейнасцю грамадзянскай супольнасці і абмежаваць магчымасці іх фінансавання. У 2011 годзе былі ўнесены змены ў Адміністрацыйны кодэкс, якія прадугледжваюць спагнанні ў дачыненні да НДА, якія прымаюць замежныя датацыі "парушаючы закон". Змены былі ўнесены і ў Крымінальны кодэкс, каб усталяваць крымінальную адказнасць за атрыманне любых замежных грантаў або датацый "парушаючы беларускае заканадаўства". Акрамя таго, з 2011 года артыкул 21 закона аб грамадскіх аб'яднаннях забараняе беларускім аб'яднанням захоўваць сродкі ў банках і іншых фінансавых установах на тэрыторыі замежных дзяржаў. У дачыненні да прыватных асоб, камерцыйных прадпрыемстваў, фондаў або ўстаноў такога абмежавання няма.

Разам з тым, ёсць дэкрэты Прэзідэнта, якія даюць ільготы і дзяржаўную падтрымку арганізацыям, якія падтрымліваюць рэжым, напрыклад, грамадскаму аб’яднанню “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі”, пераемніку камуністычнай моладзевай арганізацыі “Камсамол”. Указ Прэзідэнта № 559 ад 17 снежня 2012 года “Аб некаторых пытаннях дзяржаўнай падтрымкі грамадскага аб’яднання “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі” гаворыць, што члены арганізацыі знаходзяцца ў калегіі Міністэрства юстыцыі, Міністэрства адукацыі ды іншых міністэрстваў і прадугледжвае фінансаванне арганізацыі з мясцовага бюджэту.[23]

“Міжнародная Амністыя” заклікае беларускія ўлады адмяніць забарону на захоўванне сродкаў у банках замежных краін (гэта тычыцца толькі аб’яднанняў), а таксама заклікае ўрад адмяніць адміністрацыйную і крымінальную адказнасць за атрыманне замежных датацый.

## 3.2 КРЫМІНАЛЬНЫ ПЕРАСЛЕД НЕЗАРЭГІСТРАВАНЫХ НДА

Спецыяльны дакладчык па правах на свабоду мірных сходаў і асацыяцый падкрэсліў, што права на свабоду аб’яднанняў у роўнай ступені тычыцца аб’яднанняў, якія не зарэгістраваныя, і што асобы, якія маюць дачыненне да незарэгістраванай арганізацыі, павінны мець магчымасць свабодна ажыццяўляць сваю дзейнасць і не павінны быць аб’ектамі крымінальнага пераследу. Ён падкрэсліў, што гэта асабліва важна, калі працэдура стварэння аб’яднання з’яўляецца цяжкай і аддаецца на водкуп адміністрацыі.[24] Тым не менш, у Беларусі мірныя грамадскія актывісты сутыкаюцца з пагрозай крымінальнага пераследу толькі за тое, што спрабуюць зарэгістраваць сваю арганізацыю. У большасці выпадкаў актывісты падалі заяўку на рэгістрацыю і ім было неаднаразова адмоўлена па адвольных прычынах (гл. ніжэй). У Законе аб грамадскіх аб’яднаннях гаворыцца, што “дзейнасць незарэгістраваных аб’яднанняў ці саюзаў забаронена на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь”. Да 2005 года члены незарэгістраваных арганізацый маглі сутыкнуцца з адміністрацыйным штрафам ці адміністрацыйным арыштам да 15 сутак.[25] 15 снежня 2005 года ў Крымінальны кодэкс быў дададзены артыкул 193-1. У выніку любая дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі, у тым ліку палітычных партый і рэлігійных арганізацый, стала прадметам крымінальнага вышуку і караецца штрафам ці пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

Пасля ўвядзення артыкула 193-1 былі абвінавачаны некалькі маладых актывістаў. Чатыры члены незарэгістраванай НДА “Партнёрства” – Мікалай Астрэйка, Эніра Браніцкая, Аляксандр Шалайка і Цімафей Дранчук былі арыштаваныя 21 лютага 2006 года і асуджаныя ў жніўні таго года за “арганізацыю і ўсталяванне незарэгістраванай арганізацыі, якая парушае правы грамадзян”. Яны планавалі сачыць за прэзідэнцкімі выбарамі, якія мелі адбыцца ў тым годзе. Мікалай Астрэйка быў асуджаны на пазбаўленне волі на два гады, Цімафей Дранчук – на адзін год, Эніра Браніцкая і Аляксандр Шалайка – на шэсць месяцаў. Апошнія былі вызваленыя 21 жніўня 2006 года, пасля таго, як адбылі поўны тэрмін зняволення. Мікалай Астрэйка быў умоўна вызвалены 17 лістапада, і Цімафей Дранчук быў умоўна-датэрмінова вызвалены 26 снежня 2006 года.

1 лістапада 2006 года Зміцер Дашкевіч, лідар моладзевага апазіцыйнага руху “Малады фронт”, быў асуджаны на пазбаўленне волі на паўтары гады за “арганізацыю альбо

ўдзел у дзейнасці незарэгістраванай няўрадавай арганізацыі”. Ён быў вызвалены ў студзені 2008 года.[26]

29 мая 2007 года яшчэ пяць членаў “Маладога фронту” – Наста Палажанка, Барыс Гарэцкі, Алег Корбан, Зміцер Федарук і Аляксей Янушэўскі – былі прыцягнутыя да адказнасці за “арганізацыю альбо ўдзел у дзейнасці незарэгістраванай арганізацыі”. Чацвёра з іх былі аштрафаваныя, адзін атрымаў афіцыйнае папярэджанне. 4 верасня 2007 года яшчэ два члены арганізацыі, Іван Шыла і Настасся Азарка, таксама былі прызнаны вінаватымі ў гэтым правапарушэнні. Настасся Азарка была аштрафаваная, а Івана Шылу суддзя прызнаў вінаватым, і выдаў папярэджанне.[27]

Зусім нядаўна артыкул 193-1 быў скарыстаны супраць рэлігійных арганізацый, каб абмежаваць іх свабоду веравызнання і аб’яднанняў. Па стане на 1 чэрвеня 2012 года тром членам незарэгістраванай пратэстанцкай царквы было дадзена афіцыйнае папярэджанне за дзеянні ад імя незарэгістраванай арганізацыі (артыкул 193-1) і за распальванне расавай, нацыянальнай або рэлігійнай нянавісці. Апошняе папярэджанне было адхілена судом, але папярэджанне па артыкуле 193-1 засталося ў сіле.[28]

У 2011 годзе Венецыянская камісія Савета Еўропы заявіла, што “па факце свайго існавання артыкул 193-1 мае эфект, які стрымлівае дзейнасць няўрадавых арганізацый” і што “абмежаванне з’яўляецца настолькі моцным, што ў неапраўданай ступені не толькі абмяжоўвае свабоду аб’яднанняў, але і свабоду меркаванняў і іх выказвання”.[29]

Нягледзячы на тое, што рэгістрацыя можа быць законным адміністрацыйным патрабаваннем, каб мець магчымасць атрымаць статус юрыдычнай асобы як арганізацыі, або для атрымання пераваг, такіх як вызваленне ад падаткаў для дабрачынных арганізацый, адсутнасць рэгістрацыі не павінна быць падставай забараняць асобам ажыццяўляць іх права на свабоду аб’яднанняў. “Міжнародная Амністыя” заклікае ўрад Беларусі неадкладна адмяніць артыкул 193-1.

## 3.3 НЕАБХОДНАСЦЬ ДЗЯРЖАЎНАЙ АЎТАРЫЗАЦЫІ – ГНЯТЛІВАЯ І ЦЯЖКАЯ ПРАЦЭДУРА

Дзяржавы маюць пазітыўныя абавязкі садзейнічаць ажыццяўленню права на свабоду аб’яднанняў. Гэта азначае, што, як заявіў Спецыяльны дакладчык па пытанні аб праве на свабоду мірных сходаў і асацыяцый, працэдура рэгістрацыі павінна быць простай і пажадана бясплатнай. Спецыяльны дакладчык таксама адзначыў, што не “працэдура папярэдняга зацвярджэння”, калі просіцца дазвол улады стварыць аб’яднанне ў якасці юрыдычнай асобы, а “паведамляльны парадак” лепш суадносіцца з міжнародным правам ў вобласці праў чалавека і павінен быць рэалізаваны дзяржавай”.[30]

У Беларусі ўсе НДА, якія жадаюць быць “аб’яднаннямі”, павінны зарэгістравацца ў Міністэрстве юстыцыі. У дадатак да больш дырэктыўнага заканадаўства ахвочыя зарэгістраваць арганізацыю сутыкаюцца з ўрадавымі чыноўнікамі, якія тлумачаць патрабаванні такім чынам, каб не дапусціць свабоду аб’яднанняў, а не палегчыць рэгістрацыю. У артыкуле 15 Закона аб грамадскіх аб’яднаннях гаворыцца, што ў рэгістрацыі можа быць адмоўлена, калі парушэнні правілаў рэгістрацыі “носяць

незваротны характар”. Як бачна са шматлікіх прыкладаў у гэтым дакладзе, арганізацыям грамадзянскай супольнасці часта адмаўляюць у рэгістрацыі нават пры нязначных памылках у дакументацыі, якія могуць быць лёгка выпраўленыя, што з’яўляецца парушэннем заканадаўства.

Арганізацыі, якім адмовілі ў рэгістрацыі, могуць звярнуцца ў суд, аднак “Міжнароднай Амністыі” не ўдалося знайсці ніводнага прыкладу паспяховага абскарджання адмовы ў рэгістрацыі. Наступствы для арганізацыі, якой адмоўлена ў рэгістрацыі, складаюцца ў тым, што яна павінна спыніць сваё існаванне і дзейнасць, альбо яе члены могуць сутыкнуцца з крымінальным пераследам за дзеянні ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

## ПРАВААБАРОНЧЫ ЦЭНТР “ВЯСНА”

Арганізацыя па абароне правоў чалавека “Праваабарончы цэнтр “Вясна”, заснаваная ў 1999 годзе, была зліквідаваная Вярхоўным судом 28 кастрычніка 2003 года па рэкамендацыі Міністэрства юстыцыі, якое сцвярджала, што для рэгістрацыі ў 2003 годзе былі прадстаўленыя несапраўдныя дакументы, і што лідары арганізацыі парушылі беларускае заканадаўства падчас маніторынгу прэзідэнцкіх выбараў у 2001 годзе. 24 ліпеня 2007 года Камітэт ААН па правах чалавека пастанавіў, што закрыццё праваабарончай арганізацыі ў 2003 годзе – гэта парушэнне права на свабоду аб’яднанняў, і што арганізацыя мусіць атрымаць права на адпаведныя сродкі прававой абароны, уключаючы перарэгістрацыю і кампенсацыю.[31] Арганізацыя вырашыла падаць заяўку на перарэгістрацыю 23 ліпеня 2007 года, але заяўка была адхілена 24 жніўня 2007 года па некалькіх прычынах. Яны ўключалі той факт, што 20 з 69 заснавальнікаў мелі адміністрацыйныя правапарушэнні за ўдзел у несанкцыянаваных дэманстрацыях і распаўсюдзе нелегальных выданняў, назва арганізацыі была такой самай, як і назва арганізацыі, зліквідаванай у 2003 годзе (“Наша Вясна”), мэты арганізацыі былі нявызначаны і што былі арфаграфічныя памылкі і памылкі ў спісе заснавальнікаў. Члены праваабарончага цэнтра “Вясна” абскардзілі гэта рашэнне ў судзе, але безвынікова. 26 студзеня 2009 года арганізацыі, на гэты раз зарэгістраванай ў якасці “Нашай Вясны”, было зноў адмоўлена ў рэгістрацыі. Міністэрства юстыцыі паставіла пад сумнеў правядзенне ўстаноўчай канферэнцыі і звярнула ўвагу на судзімасць членаў групы па адміністрацыйных справах. Яно таксама сцвярджала, што былі недакладнасці ў спісе заснавальнікаў, не быў апісаны механізм абрання старшыні і сакратара, у адным з дакументаў не хапала назвы арганізацыі, штаб-кватэра арганізацыі была занадта цеснай. 22 красавіка 2009 года Вярхоўны Суд падтрымаў рашэнне аб ліквідацыі арганізацыі.

Вясной 2009 года сябры арганізацыі яшчэ раз звярнуліся з заявай аб рэгістрацыі ў Міністэрства юстыцыі пад назвай Праваабарончае грамадскае аб'яднанне «Наша Вясна». Пазней у 2009 годзе была атрыманая адмова, у сувязі з тым, што чатыры заснавальніка, з больш за 50, названых у дакументах, пададзеных на рэгістрацыю, зрабілі памылкі ў назвах месцаў працы. Адзін з заснавальнікаў указаў, што з'яўляецца кіраўніком дзіцячага гуртка, замест дзіцячай секцыі; і іншая заснавальнік паказала, што працуе настаўніцай у сярэдняй школе, замест ўказанні поўнага назвы - агульнаадукацыйная сярэдняя школа.

У лютым 2011 года Генеральная пракуратура Беларусі вынесла афіцыйнае папярэджаньне Алесю Бяляцкаму, старшыні арганізацыі, у дачыненні да яго дзейнасці ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Папярэджаньне было абскарджана ў судзе Цэнтральнага раёна горада Мінска, а пазней у парадку касацыі ў Мінскім гарадскім судзе. Абедзве судовыя інстанцыі пакінулі яго ў сіле.

Праваабарончы цэнтр “Вясна” працягвае працаваць у якасці незарэгістраванай арганізацыі, але сутыкаецца з нязменным ціскам. 4 жніўня 2011 года старшыня арганізацыі Алесь Бяляцкі быў асуджаны да турэмнага зняволення на чатыры з паловай гады за атрыманне сродкаў для арганізацыі з рахункаў замежных банкаў, таму што адсутнасць рэгістрацыі азначае, што арганізацыя не можа адкрываць банкаўскія рахункі ў Беларусі. У лістападзе 2012 года ў выніку асуджэння Алеся Бяляцкага арганізацыя страціла свае офісныя памяшканні (гл. с. 34-35).

У кастрычніку 2010 года Камітэт ААН па правах чалавека прызнаў, што Беларусь парушыла права на свабоду аб’яднанняў, калі ў 2003 годзе яна адмовіла ў рэгістрацыі НДА “Грамадзянскія ініцыятывы” ў Гомелі. Сярод прычын адмовы былі наступныя: той факт, што сярод мэтаў арганізацыі значылася сувязь з іншымі “мясцовымі і міжнароднымі арганізацыямі”, быў несумяшчальны з Дэкрэтам Прэзідэнта № 2 ад 1999 года, які прадугледжвае, што арганізацыі могуць уступаць у сувязь толькі з арганізацыямі такога ж тыпу; заяўленыя мэты арганізацыі былі апісаныя ў адным месцы як “гуманітарныя”, а ў іншым як “гуманістычныя”; у дадатку не ўдакладнялася, у якім пакоі заяўленага будынка будзе размешчаны галоўны офіс[32]. Зварот у абласны суд быў адхілены ў маі 2004 года, у чэрвені 2004 года Вярхоўны Суд адхіліў іх апеляцыю.

У 2003 годзе мясцовыя члены “Міжнароднай Амністыі” спрабавалі зарэгістравацца ў Беларусі ў якасці міжнароднай арганізацыі. Аднак яны атрымалі ліст, які тлумачыў, што былі праблемы з выкарыстаннем сімвала “Amnesty International”. Аніякага іншага тлумачэння не было. У 2005 годзе члены арганізацыі паспрабавалі зарэгістравацца ў якасці мясцовай установы. Ім сказалі, што гэта магчыма, калі яны загадзя ўзгодняць ўсе дзеянні з дзяржаўнымі органамі. Пасля гэтага члены “Міжнароднай Амністыі” вырашылі не рэгістравацца, бо гэта пагражала б іх здольнасці функцыянаваць незалежна.

“Міжнародная Амністыя” заклікае беларускія ўлады спрасціць працэдуры рэгістрацыі і забяспечыць, каб службовыя асобы, якія рэгіструюць НДА, рабілі гэта такім чынам, каб аблегчыць права на свабоду аб’яднанняў, і не перашкаджалі ім.

Улада павінна забяспечыць, каб службовыя асобы правільна ўжывалі дзейнае заканадаўства і не ліквідавалі НДА па відавочна нязначным парушэнням Закона аб грамадскіх аб’яднаннях, якія могуць быць выпраўленыя, або занадта вузка інтэрпрэтавалі дапушчальную дзейнасць НДА.

Улада павінна выконваць усе рашэнні Камітэта ААН па правах чалавека аб рэгістрацыі арганізацый, якія былі адвольна пазбаўлены свайго права на свабоду аб’яднанняў, такія як “Праваабарончы цэнтр “Вясна” і “Грамадзянскія ініцыятывы”.

## 3.4 ЗАКРЫЦЦЁ І СПЫНЕННЕ ДЗЕЙНАСЦІ НДА

Дзяржавы абавязаны не перашкаджаць ажыццяўленню права на свабоду аб'яднанняў, члены аб'яднанняў павінны быць у стане вызначаць свой статут, структуру і дзейнасць, а таксама прымаць іншыя рашэнні без умяшальніцтва з боку дзяржавы.[33]

Пасля рэгістрацыі НДА ў Беларусі рэгулярна правяраюцца і кантралююцца Міністэрствам юстыцыі ды іншымі афіцыйнымі органамі, напрыклад, падатковымі. Указ Прэзідэнта № 510 ад 16 кастрычніка 2009 года вызначае ступень рызыкі (высокую, сярэднюю і нізкую) для НДА, а таксама графік іх праверак.[34] У любы час афіцыйныя органы могуць зарэгістраваць скаргу адносна адпаведнасці арганізацыі патрабаванням заканадаўства і распачаць праверку. Любое парушэнне можа прывесці да папярэджання, прыпынення дзейнасці або ў рэшце рэшт да ліквідацыі (пастаяннага закрыцця). У многіх выпадках, якія трапляюць у поле зроку “Міжнароднай Амністыі”, міністэрствы падавалі скаргі на НДАпасля таго, як прыймалі рашэнне аб зменах у заканадаўстве або афіцыйнай палітыцы.

## “ДОБРАЯ ВОЛЯ”

“Добрая воля” з'яўляецца НДА, якая дапамагае прыёмным бацькам і ўсынавіцелям. Арганізацыя была зарэгістравана і існавала з 1998 года, раней у яе не было ніякіх праблем з уладай. Тым не менш, цягам 2011 і 2012 гадоў арганізацыя падавала шэраг скаргаў аб парушэннях працэдур Міністэрствам адукацыі, якое валодае юрысдыкцыяй датычна ўсынаўлення. Гэта арганізацыя таксама спрыяла грамадскаму абмеркаванню змен ў заканадаўстве, якія датычацца правілаў выхавання і ўсынаўлення, і даслала заканадаўчыя прапановы ў Міністэрства адукацыі. У чэрвені 2012 года ў Міністэрстве юстыцыі “Добрай волі” паведамілі, што на яе паступіла скарга ад Міністэрства адукацыі. 15 чэрвеня Міністэрства юстыцыі вынесла ёй афіцыйнае папярэджанне, сцвярджаючы, што арганізацыя парушыла Закон аб грамадскіх аб'яднаннях, таму што: а) яны выкарыстоўвалі эмблему, а таксама канверты з выявай, якія не былі зарэгістраваны ў Міністэрстве юстыцыі; б) найменне “Добрая воля” на гумовай пячатцы арганізацыі было напісана двюма вялікімі літарамі, у той час як імя, зарэгістраванае ў Міністэрстве юстыцыі, было напісана толькі з вялікай літарай «Д» у першым слове, в) арганізацыя мела аўдытара не з рэвізійнай камісіі, як пазначана ў статуце, г) яны не змаглі праінфармаваць Міністэрства аб змене адрасу. Ім было прапанавана выправіць гэтыя памылкі на працягу месяца. “Добрая воля” выправіла ўсе недахопы, акрамя двух: яны не змаглі ўдакладніць з Міністэрствам юстыцыі, якая эмблема была выкарыстана няправільна, і новыя гумовыя пячаткі не маглі быць зроблены на працягу месяца. Нягледзячы на іх намаганні па выкананні патрабаванняў з боку Міністэрства юстыцыі, яны



© Скоробогатый Леонид Иванович

атрымалі паведамленне пра тое, што па іх справе будзе прынята рашэнне суда. 26 лістапада 2012 года Вярхоўны Суд прыпыніў дзейнасць арганізацыі “Добрая воля”, пакуль яны не выправяць памылкі, якія засталіся. Яны гэта зрабілі і аднавілі сваю дзейнасць у канцы студзеня 2013 года, але, як распавёў “Міжнароднай Амністыі” дырэктар арганізацыі, на гэтага было патрачана некалькі месяцаў[35]. А зусім нядаўна, 20 сакавіка 2013 года, НДА атрымала паведамленне ад Вярхоўнага Суда аб тым, што Міністэрства юстыцыі пачало грамадзянскую справу аб яе ліквідацыі.

У дачыненні да НДА і абаронцаў правоў чалавека часта праводзіліся расследаванні з боку падатковых органаў, часам з парушэннямі міжнародных пагадненняў аб тэхнічнай дапамозе (гл. справу Беларускага Хельсінкскага камітэта на с. 36-37), а часам за дробныя ці адвольныя прычыны, як у выпадку з арганізацыяй “Платформа”. Гэтыя расследаванні могуць прывесці да неадкладнай ліквідацыі арганізацый або да асуджэння асоб ў крымінальным парадку (гл. справу Алеся Бяляцкага на с. 34-35).

## “ПЛАТФОРМА”

*“Уся гэта бюракратычная валакіта адымае занадта шмат энергіі і рэсурсаў, і ўрэшце ўсім гэта надакучыла. Мы не маем досыць маленькіх перамог у Беларусі, і калі вы дамагліся поспеху ў рэгістрацыі – гэта перамога”.*

Андрэй Бандарэнка, заснавальнік і старшыня арганізацыі “Платформа”.

“Платформа” ўяўляе з сябе арганізацыю па правах чалавека, якая праводзіць маніторынг і дакументуе аб выпадках ужывання катаванняў і іншых відаў жорсткага абыходжання ў турмах і міліцэйскіх участках, а таксама падтрымлівае былых зняволеных. Арганізацыя вырашыла зарэгістравацца ў якасці ўстановы ў 2011 годзе. Гэтая працэдура патрабуе ад арганізацыі зарэгістраваць назву ў мясцовым органе ўлады таго раёна, дзе яны хацелі б працаваць, і як толькі назва зарэгістравана, заснавальнікам дастаткова проста паведаміць мясцовым уладам пра заснаванне ўстановы, замест таго, каб пытацца дазволу. Адзіная перашкода – знайсці прымальную назву. “Платформа” прадставіла 79 магчымых варыянтаў назваў перад тым, як назва была зацверджана. Многія варыянты былі адхілены на той падставе, што іншыя інстытуты мелі тую ж назву. Прадбачыўшы гэтую праблему, старшыня арганізацыі Андрэй Бандарэнка ўключыў сваё імя і пашпартныя дадзеныя ў некаторыя з назваў, мяркуючы, што не магло быць іншага чалавека з такім імем з аднолькавым нумарам пашпарта, але яму па-ранейшаму кажуць, што ўжо існуе арганізацыя з аднолькавым імем.

Тым не менш, 9 кастрычніка 2012 года арганізацыя была ліквідавана па рашэнні Гаспадарчага суда горада Мінска за тое, што яна ва ўсталяваны тэрмін не змагла прадставіць дэкларацыю аб даходах, і за тое, што не праінфармавала падатковыя органы пра змену адраса. Перад тым, як было прынята рашэнне аб ліквідацыі, мелі месца шэраг адкрытых заяў Андрэя Бандарэнка, у тым ліку асабісты зварот да Міжнароднай федэрацыі хакея з заклікам устрымацца ад правядзення чэмпіянату ў 2014 годзе ў Беларусі, пакуль усе палітычныя зняволеныя не будуць вызваленыя. Андрэй Бандарэнка, старшыня арганізацыі, настойваў на тым, што ён своечасова прадставіў дэкларацыю аб даходах і што падатковая служба неаднаразова губляла дакумент, а таксама, што арганізацыя не змяніла свой юрыдычны адрас, але для

сваёй працы выкарыстоўвала іншае дадатковае памяшканне. Напярэдадні ліквідацыі Андрэю Бандарэнку неаднаразова пагражалі і перасследавалі супрацоўнікі праваахоўных органаў з-за адкрытай крытыкі дзяржаўнай улады. У снежні 2012 года арганізацыя была паўторна зарэгістравана ў якасці ўстановы пад назвай “Платформ иннавэйшн”.

“Міжнародная Амністыя” нагадвае беларускім уладам, што ліквідацыя арганізацыі з’яўляецца выключнай санкцыяй, яе неабходна выкарыстоўваць толькі ў скрайнім выпадку, яна ні ў якім разе павінна ўжывацца, калі ў дадзеным канкрэтным выпадку такая мера можа лічыцца неадэкватнай і непатрэбнай у дэмакратычным грамадстве. Ліквідацыя арганізацый, як у выпадку з “Платформай”, па бюракратычных прычынах з’яўляецца парушэннем права яе членаў на свабоду аб’яднанняў.

# 4. СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Закон аб масавых мерапрыемствах, які ўступіў у сілу ў 1997 годзе, вызначае масавае мерапрыемства, як “сход, мітынг, шэсце, дэманстрацыю або пікетаванне”. Мітынг апісваецца як “загадзя спланаваны сумесны сход грамадзян у вызначаным месцы з мэтай калектыўнага абмеркавання і вырашэння пытанняў, якія ўяўляюць для іх цікавасць”. Вызначэнне масавага мерапрыемства не адпавядае міжнародным стандартам. Пікетаванне з’яўляецца “публічным выказваннем грамадзянінам або групай грамадзян грамадска-палітычных, асабістых ці іншых інтарэсаў, альбо пратэсту (без руху), уключна з галадоўкамі”. Нягледзячы на тое, што МПГПП не ўключае вызначэнне таго, што ўяўляе з сябе адкрыты сход, як звычай, пагаджаюцца, што адкрыты сход – гэта “сукупнасць больш чым аднаго чалавека на законных падставах у грамадскім месцы”. Такім чынам, ён складаецца больш чым з аднаго чалавека.[36] Як будзе паказана ніжэй, нават дзеянні аднаго чалавека могуць патрапіць пад Закон аб масавых мерапрыемствах. Нягледзячы на абмежаванні на свабоду сходаў, некаторыя адважныя людзі працягваюць рызыкаваць атрымаць штраф ці турэмнае зняволенне, каб выказаць свае меркаванні.

## 4.1 ЗАРЭГУЛЯВАНАСЦЬ: ШТО НЕ ДАЗВОЛЕНА – ТОЕ ЗАБАРОНЕНА

Спецыяльны дакладчык ААН па правах на свабоду мірных сходаў і аб’яднанняў і Кіруючыя прынцыпы АБСЕ па свабодзе мірных сходаў рэкамендуюць, што павінна мець месца прэзумпцыя на карысць правядзення сходаў і што “ўсё, што відавочна не забаронена законам, павінна быць успрынята як дапушчальнае”.[37] У Беларусі Закон аб масавых мерапрыемствах мае такі падыход: забаронена ўсё, што не дазволена законам, і ўтрымлівае падрабязныя правілы правядзення публічных мерапрыемстваў. У адпаведнасці з Венецыянскай камісіяй Савета Еўропы, “закон характарызуецца падрабязнай зарэгуляванасцю працэдурных аспектаў правядзення сходаў”.[38]

Напрыклад, арганізатарамі масавага мерапрыемства з колькасцю ўдзельнікаў больш за 1000 чалавек могуць быць толькі палітычныя партыі, прафесійныя саюзы “ці іншыя арганізацыі”. Фізічныя асобы могуць арганізаваць любы сход да 1000 удзельнікаў, але яны павінны быць грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць на яе тэрыторыі, ва ўзросце больш за 18 гадоў і мець права голаса. Гэтыя палажэнні з’яўляюцца дыскрымінацыйнымі, паколькі яны эфектыўна пазбаўляюць дзяцей, замежнікаў, асоб, якія шукаюць прытулку, мігрантаў і іншых асоб, якія не з’яўляюцца грамадзянамі, права на свабоду сходаў.

Дэкрэт Прэзідэнта № 11 (ад 7 мая 2001 года) “Аб некаторых мерах па ўдасканаленні парадку правядзення сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў, дэманстрацый і іншых масавых мерапрыемстваў у Рэспубліцы Беларусь “патрабуе, каб арганізатары публічных мерапрыемстваў прадставілі копіі сертыфікатаў і дагавораў, заключаных з пастаўшчыкамі дзяржаўных паслуг па грамадскім парадку і бяспецы, медыцынскім

абслугоўванні і ачыстцы месца ў канцы сустрэчы. Спецыяльны дакладчык па правах на свабоду мірных сходаў і аб'яднанняў дакладна выказаўся, што арганізатары публічных мерапрыемстваў "не павінны браць на сябе якія-небудзь фінансавыя выдаткі на прадастаўленне дзяржаўных паслуг падчас сходу (напрыклад, міліцыі, медыцынскіх службаў і мер бяспекі).[39]

Артыкул 9 Закона аб масавых мерапрыемствах забараняе любыя сходы менш чым у 200 метрах ад Рэзідэнцыі Прэзідэнта, Нацыянальнага сходу, Савета Міністраў, падземных пешаходных пераходаў, станцый метро, і менш чым у 50 метрах ад любога дзяржаўнага будынка, пасольства, суда, будынка пракуратуры і любога будынка, звязанага з "паслугамі абароны, бяспекі і камунальнымі паслугамі, грамадскім транспартам, забеспячэннем вады, цяпла і энергіі, пачатковымі і сярэднімі школамі". Спіс забароненых месцаў працягваецца і ўключае ў сябе бальніцы, атамныя электрастанцыі, любыя будынкі, звязаныя з вытворчасцю або захоўваннем зброі, радыё-і тэлевізійныя станцыі і будынкі небяспечнай прамысловасці. Хоць гэта можа быць апраўдана для абмежавання дэманстрацый паблізу ад заводаў ці іншых месцаў, якія могуць несці рызыку для здароўя і бяспекі насельніцтва, спіс забароненых месцаў настолькі падрабязны, што ён эфектыўна прадухіляе любыя дэманстрацыі ў цэнтры буйных гарадоў.

Далейшыя змены ўступілі ў сілу ў кастрычніку 2011 года, яны патрабуюць, каб арганізатары паведамлялі "крыніцы фінансавання", якія выкарыстоўваюцца для кожнага мерапрыемства. Адначасовыя змены ў іншых законах далі супрацоўнікам праваахоўных органаў больш шырокія паўнамоцтвы, каб рабіць аўдыё- і відэазапісы дэманстрацый, абмежаванні доступу ўдзельнікаў на мерапрыемства і праводзіць дагляд удзельнікаў.

Артыкул 15 Закона аб масавых мерапрыемствах прадугледжвае неадкладную ліквідацыю любой арганізацыі, якая не выконвае закон або арганізуе сход, які выклікае "сур'ёзнае пашкоджанне або парушае правы і законныя інтарэсы грамадзян, арганізацый або дзяржаўныя ці грамадскія інтарэсы".

"Міжнародная Амністыя" заклікае ўлады Беларусі ўнесці папраўкі ў Закон аб масавых мерапрыемствах у адпаведнасці з міжнароднымі абавязкамі ўрада забяспечыць свабоду сходаў шляхам:

- зніжэння абмежаванняў на месца правядзення сходаў да толькі тых, якія ў дадзеным выпадку з'яўляюцца відавочна неабходнымі для дапушчальнай мэты, прызнанай у міжнародным праве ў вобласці правоў чалавека;
- адмены патрабавання для арганізатараў забяспечваць паслугі, якія асвятляюць гэты сход;
- адмены шырокіх абмежаванняў на тых, хто можа арганізаваць сходы;
- адмены патрабавання паведамлення пра фінансавыя крыніцы падзеі;
- адмены артыкула 15 Закона аб масавых мерапрыемствах, які прадугледжвае ліквідацыю любой арганізацыі, якая не выконвае гэты закон.

## 4.2 НЕАБХОДНАСЦЬ АТРЫМАЦЬ ДАЗВОЛ

У адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі правоў чалавека ажыццяўленне права на свабоду сходаў не павінна быць прадметам папярэдняга дазволу, максімум павінна

быць прадметам працэдуры папярэдняга апавяшчэння. Зразумела, што ўладзе, магчыма, спатрэбіцца прыняць меры для рэгулявання дарожнага руху ды іншыя меры для палягчэння права на свабоду сходаў, але перыяд паведамлення не павінен быць большы, чым за 48 гадзін да пачатку мерапрыемства. Спецыяльны дакладчык па правах на свабоду мірных сходаў і аб'яднанняў заявіў, што нават у тых выпадках, калі дэманстранты не паведамляюць уладзе, арганізатары мірных мерапрыемстваў не павінны быць прыцягнутыя да крымінальнай ці адміністрацыйнай адказнасці.[40]

У жніўні 2003 года ўступілі ў сілу змены ў Законе аб масавых мерапрыемствах. Арганізатары павінны падаць заяўку на правядзенне дэманстрацый і мерапрыемстваў мінімум за 15 дзён да іх пачатку. Мясцовыя органы ўлады абавязаны праінфармаваць арганізатараў аб тым, ці была іх заяўка задаволена, не менш чым за пяць дзён да мерапрыемства. Любая прапаганда мерапрыемства да атрымання афіцыйнага дазволу забаронена. Любое іншае змяненне робіць любы "публічны заклік да пачатку" несанкцыянаваным сходам або мітынгам, а гэта ўжо адміністрацыйнае правапарушэнне, якое караецца штрафам або кароткім тэрмінам утрымання пад вартай.

"Міжнародная Амністыя" нагадвае беларускім уладам, што ў адпаведнасці з міжнародным правам у галіне правоў чалавека, права на свабоду мірных сходаў можа быць падвергнута толькі тым абмежаванням, якія відавочна неабходны для аховы дзяржаўнай бяспекі, грамадскай бяспекі, грамадскага парадку, здароўя або маралі насельніцтва ці правоў і свабод іншых асоб. Працяглы тэрмін паведамлення, іншыя палажэнні, якія рэгулююць грамадскія мерапрыемствы і патрабаванне афіцыйнага дазволу – гэта непатрэбныя абмежаванні, якія не адпавядаюць абавязкам Беларусі паважаць і забяспечваць свабоду мірных сходаў.

## 4.3 СПАНТАННЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ

Еўрапейскі суд па правах чалавека заявіў, што "ў асаблівых абставінах, калі неадкладнае рэагаванне ў форме дэманстрацыі на палітычныя падзеі можа быць апраўдана, рашэнне пра роспуск наступнага мірнага схода выключна з-за адсутнасці неабходнага папярэдняга паведамлення, без якіх-небудзь супрацьпраўных дзеянняў з боку ўдзельнікаў, складае непамернае абмежаванне на свабоду сходаў".[41] Спецыяльны дакладчык ААН па правах на свабоду мірных сходаў і асацыяцый рэкамендаваў прызнаваць спантанныя сходы законнымі, а таксама вызваляць іх ад неабходнасці папярэдняга паведамлення.[42]

У беларускім заканадаўстве не існуе ніводнага палажэння датычна спантанных дэманстрацый, якія могуць адбыцца ў адказ на палітычныя ці іншыя падзеі. Як раз такая сітуацыя ўзнікла 19 снежня 2010 года, калі актывісты апазіцыі і члены шырокай грамадскасці вырашылі сабрацца ў цэнтры Мінска ў знак пратэсту супраць сфальсіфікаваных, па іх меркаванні, вынікаў выбараў (гл. с. 27).

"Міжнародная Амністыя" заклікае ўлады перагледзець Закон аб масавых мерапрыемствах і зрабіць выключэнне да патрабавання аб папярэднім апавяшчэнні для спантанных мерапрыемстваў, калі папярэдняе паведамленне з'яўляецца немагчымым.

## 4.4 АДМІНІСТРАЦЫЙНЫ ПЕРАСЛЕД

Грамадскія актывісты падвяргаюцца адміністрацыйным санкцыям, калі яны парушаюць строгія патрабаванні для грамадскіх сходаў, але яны таксама падвяргаюцца частай адміністрацыйнай адказнасці як адной з формаў прыгнёту.

Адміністрацыйны кодэкс ахоплівае меней цяжкія правапарушэнні, такія як "дробнае хуліганства" (арт. 17.1) і "парушэнне парадку арганізацыі ці правядзення масавых мерапрыемстваў" (арт. 23.34). У 2011 годзе ў артыкул 23.34 былі ўнесены змены па зніжэнні парога за злачынства, было адменена патрабаванне, каб яно было паўторным, і што толькі арганізатар мерапрыемства можа быць прыцягнуты да адказнасці.

### 4.4.1 ЦІСК НА АКТЫВІСТАЎ

На працягу 2012 года па меншай меры 15 праваабаронцаў, эколагаў, журналістаў і актывістаў апазіцыі былі прыцягнуты да адказнасці па артыкуле 17.1 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях за брыдкаслоўе ў грамадскім месцы. Пакаранне за гэта – ад штрафу да пазбаўлення волі на 10 дзён.

Павел Вінаградаў, член моладзевага палітычнага руху "Zmena", правёў агулам 66 дзён у заключэнні. За перыяд з 30 снежня 2011 года па 12 снежня 2012 года ён атрымаў 8 асобных адміністрацыйных пакаранняў, усе з іх – за дробнае хуліганства ці парушэнне парадку правядзення мітынгаў. Напрыклад, 30 снежня 2011 года ён быў запрошаны ў міліцэйскі ўчастак Маскоўскага раёна горада Мінска для правядзення "прафілактычнай гутаркі", у канцы якой быў асуджаны ў адпаведнасці з Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях да трох дзён за нецэнзурную лаянку. Ён правёў навагоднія святы ў зняволенні. 2 сакавіка 2012 года ён быў асуджаны на сем дзён за брыдкаслоўе, а 25 красавіка – на пяць дзён за тое ж самае. 7 верасня 2012 года міліцыянеры затрымалі яго каля ўласнага дома і адвезлі ў міліцэйскі ўчастак Маскоўскага раёна горада Мінска, а там абвінавацілі яго ў брыдкаслоўі ў грамадскім месцы. Пасля гэтага Вінаградаў быў асуджаны да пяці сутак арышту. Ва ўсіх выпадках сведкамі яго брыдкаслоўя ў грамадскім месцы былі міліцыянеры.

### 4.4.2 АДМІНІСТРАЦЫЙНЫ ПЕРАСЛЕД ЗА ПРАВЯДЗЕННЕ НЕСАНКЦЫЯНАВАНЫХ МІТЫНГАЎ

У Беларусі большасць зваротаў па правядзенню грамадскіх мерапрыемстваў адхіляюцца. Шмат людзей не звяртаюцца па дазвол, ведаючы, што ім будзе адмоўлена ў арганізацыі мерапрыемства ў цэнтры горада. Дзясяткі чалавек у год падвяргаюцца штрафам і турэмнаму зняволенню за мірнае ажыццяўленне свайго права на свабоду сходаў.[43]

## ПРЫЦЯГНУТЫ ДА АДКАЗНАСЦІ ЗА МАРШ З УДЗЕЛАМ АДНАГО ЧАЛАВЕКА

Праваабаронца **Раман Кісляк** быў затрыманы 16 кастрычніка 2011 года пасля таго, як адзін хадзіў па галоўнай вуліцы Брэста з мегафонам і прасіў аб вызваленні абаронцы правоў чалавека Алеся Бяляцкага. Ён быў абвінавачаны ў правядзенні несанкцыянаванага пікету, нягледзячы на яго сцвярджэнне, што яго дзеянні не падпадаюць пад вызначэнне пікету, як гэта вызначана законам, гэта

можа быць вызначана як “марш”, таму што ў той час ён рухаўся па вуліцы. Як адзін чалавек ён мог ажыццяўляць “марш”, але, як тлумачылася ў пачатку гэтай часткі, закон забараняе пікеты асобнымі асобамі. На наступную раніцу ён паўстаў перад адміністрацыйным судом, і суддзя вярнуў справу ў міліцыю для далейшага расследавання. 28 кастрычніка суд Ленінскага раёна Брэста наклаў штраф у памеры € 3. Апеляцыйны суд падтрымаў гэтае рашэнне.




© svaboda.org

У 2012 годзе Камітэт ААН па правах чалавека вынес рашэнне па шасці справах у дачыненні да Беларусі аб тым, што былі парушаныя правы на свабоду сходаў і права на свабоду выказвання ў сувязі са свабодай сходаў.

## АШТРАФАВАЛІ ЗА ЎРУЧЭННЕ ПАДАРУНКА

25 сакавіка 2008 года ў гадавіну ўтварэння Беларускай Народнай Рэспублікі (1918), якая адзначаецца апазіцыяй у Беларусі як Дзень Волі, **Антаніна Піванос** і дзве іншыя жанчыны ўручылі мясцовым актывістам апазіцыі падарунак – габелен з вышытым рэлігійным тэкстам (Ойча наш). Яны стаялі ў цэнтры Віцебска. Калі Антаніна Піванос разгарнула яе габелен, яна была затрымана міліцыяй па абвінавачванні ў парушэнні працэдуры арганізацыі і правядзення пікетаў. У судзе ў той жа дзень яна сцвярджала, што не было ніякіх законаў супраць уручэння падарункаў, але яна была прызнана вінаватай у адпаведнасці з адміністрацыйным кодэксам у парушэнні Закона аб масавых мерапрыемствах, таму што яна не звярнулася за атрыманнем дазволу на правядзенне мерапрыемтсва. Яна была аштрафавана на 70000 рублёў (€ 6,5),[44] і яе габелен быў канфіскаваны. Яна абскардзіла штраф у раённам судзе Віцебска, які 16 красавіка адхіліў яе апеляцыю. 11 чэрвеня 2008 года яе апеляцыя ў Вярхоўны Суд таксама была адхілена. Затым яна звярнулася ў Камітэт ААН па правах чалавека, 29 кастрычніка 2012 года Камітэт прыйшоў да высновы, што яе права на свабоду выказвання меркавання ў адпаведнасці з артыкулам 19 МПГПП было парушана, і абавязаў урад Беларусі забяспечыць яе “эфектыўным сродкам прававой абароны, у тым ліку вярнуць канфіскаваную маёмасць або яе кошт,

пакрыць бягучыя кошты штрафу і любыя панесеныя [ею] судовыя выдаткі разам з кампенсацыяй”. Камітэт па правах чалавека таксама нагадаў ураду пра абавязкі па прадухіленні падобных парушэнняў у будучыні. Урад не растлумачыў Камітэту па правах чалавека, чаму было неабходна абмежаваць права Антаніны Піванос на свабоду сходаў, але заявіў толькі тое, што яна не выканала Закон аб масавых мерапрыемствах, які “ставарае ўмовы для рэалізацыі канстытуцыйнага права і свабод грамадзян і абароны грамадскай бяспекі і грамадскага парадку”.[45] Пасля рашэння Вярхоўнага Суда ў чэрвені 2008 года Антаніна Піванос выкупіла свой габелен у ўлады, таму што яна выдаткавала на яго стварэнне шмат часу.




© Правозащитный центр «Вясна»

“Міжнародная Амністыя” заклікае ўрад Беларусі выконваць рашэнні Камітэта ААН па правах чалавека, які знайшоў парушэнні свабоды выказвання меркавання, аб’яднанняў і сходаў, а таксама забяспечыць пакрыццё шкоды, у тым ліку вяртанне канфіскаванай маёмасці і кампенсацыю ў выпадку неабходнасці.

## 4.5 ГВАЛТОЎНЫ РАЗГОН – ПАДЗЕІ СНЕЖНЯ 2010 ГОДА

На працягу многіх гадоў “Міжнародная Амністыя” зафіксавала шмат выпадкаў, калі ўдзельнікі несанкцыянаваных дэманстрацый былі арыштаваныя і затрыманыя, а часам падвяргаліся збіццю з боку супрацоўнікаў праваахоўных органаў.

У 2009 годзе актывісты апазіцыі і правоў чалавека праводзілі штомесячныя дэманстрацыі ў гадавіну знікнення двух вядучых дзеячоў апазіцыі Віктара Ганчара і Юрыя Захаранкі, бізнесмена Анатоля Красоўскага ў 1999 годзе, журналіста Дзмітрыя Завадскага ў 2000 годзе. 16 верасня 2009 года супрацоўнікі міліцыі ў Мінску, як сцвярджаецца, выкарыстоўвалі празмерную сілу для разгону дэманстрантаў і затрымалі 31 чалавека на працягу трох гадзін, перш чым адпусціць іх без прад’яўлення абвінавачванняў. Дэманстранты паведамілі, што яны моўчкі стаялі з

партрэтамі зніклых, калі каля 40 мужчын у цывільным падышлі і пачалі збіваць іх, за імі кіраваўся АМАП, які іх затрымаў і даставіў на аўтобусе ў аддзел міліцыі Цэнтральнага раёна. Там, па наяўных паведамленнях, іх прымусілі стаяць тварам да сцяны на працягу трох гадзін, яны падвяргаліся вусным абразам, пагрозам і збіццю.

Цягам мая, чэрвеня і ліпеня 2011 года праходзілі рэгулярныя штотыднёвыя "маўклівыя акцыі". Групы людзей па ўсёй краіне моўчкі прагульваліся, пляскалі ў далоні або адначасова ўключалі мелодыі на сваіх мабільных тэлефонах. Праваабарончы цэнтр "Вясна" паведаміў, што былі затрыманыя больш за 2000 чалавек, якія на працягу гэтага перыяду ўдзельнічалі ў "маўклівых акцыях" па ўсёй Беларусі, некаторыя з іх былі збітыя і падвергнутыя іншым формам неправамернага прымянення сілы з боку міліцыі. Каля 80% затрыманых пасля былі асуджаныя да адміністрацыйнага арышту ад 5 да 15 сутак альбо штрафу. 29 чэрвеня 2011 года карэспандэнт ВВС быў збіты супрацоўнікамі праваахоўных органаў у цывільным,[46] 4 ліпеня з'явіліся паведамленні, што супраць пратэстоўцаў быў выкарыстаны слезацечны газ.

Аднак самы шакуючы прыклад неапраўданага выкарыстання сілы міліцыяй адбыўся пасля прэзідэнцкіх выбараў у 2010 годзе.

> *"За мае трынаццаць гадоў у якасці абаронцы правоў чалавека ў Беларусі я ніколі не бачыў такога збіцця".*
> Алег Воўчак, старшыня НДА "Прававая дапамога насельніцтву", апісвае сілавы разгон дэманстрацыі 19 снежня 2010 года ў Мінску.

19 снежня 2010 года пасля прэзідэнцкіх выбараў адбылася найбуйнейшая публічная дэманстрацыя ў найноўшай гісторыі Беларусі, яна была падаўлена з беспрэцэндэнтнай жорсткасцю з боку супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Пасля разгону міліцыяй вялікай дэманстрацыі ў цэнтры Мінска больш за 700 чалавек былі затрыманыя, і многія, у тым ліку выпадковыя мінакі, былі збітыя і параненыя супрацоўнікамі праваахоўных органаў.

Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў у 2010 годзе выказваліся апасенні, што выбары не будуць праведзены сумленна. Многія кандыдаты ад апазіцыі заклікалі сваіх прыхільнікаў сабрацца 19 снежня на Кастрычніцкай плошчы ў цэнтры Мінска ў 8 гадзін вечара пасля закрыцця выбарчых участкаў. Лідары апазіцыі не звярталіся па дазвол на правядзенне дэманстрацыі 19 снежня, мяркуючы, што такі дазвол не можа быць атрыманы ў адпаведнасці з дзейным заканадаўствам, але яны прасілі сустрэчы з міністрам унутраных спраў і старшынём КДБ, каб абмеркаваць запланаваную дэманстрацыю. 17 снежня старшыня КДБ паведаміў прэсе, што лідары апазыцыі папрасілі аб сустрэчы, каб абмеркаваць бяспеку дэманстрантаў, але "супрацоўнікі праваахоўных органаў не могуць абмяркоўваць такія пытанні, бо заклікі да дэманстрацыі з'яўляюцца незаконнымі".[47]

Па словах назіральнікаў праваабарончых арганізацый, на Кастрычніцкай плошчы сабралася да 30 000 дэманстрантаў, затым яны мірна прайшлі па галоўнай вуліцы да Дома ўрада, Рэзідэнцыі Парламента і Цэнтральнай выбарчай камісіі, без перашкод з боку супрацоўнікаў праваахоўных органаў, якія спынілі рух транспарту, каб дазволіць прайсці дэманстрантам. Аднак праз гадзіну пасля пачатку дэманстрацыі група з

прыкладна 20 чалавек у масках, якія стаялі каля дзвярэй Дома ўрада, узброеныя палкамі, пачалі заклікаць натоўп штурмаваць будынак і разбіваць вокны. Пасля гэтага міліцыя акружыла дэманстрантаў і пачала затрымліваць і збіваць людзей, якія сабраліся на плошчы або стаялі побач.

“Міжнародная Амністыя” прызнае абавязак супрацоўнікаў праваахоўных органаў папярэджваць злачыннасць і забяспечваць бяспеку насельніцтва і права абараняць сябе пры нападзе. Тым не менш, у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі праваахоўных органаў, у прыватнасці, з Кодэксам ААН аб паводзінах для супрацоўнікаў праваахоўных органаў і Асноўнымі прынцыпамі ААН па ўжыванні сілы і зброі супрацоўнікамі праваахоўных органаў (Асноўныя прынцыпы ААН)[48], яны павінны ўвесь час выконваць свае абавязкі такім чынам, каб забяспечыць поўную павагу права на жыццё, свабоду і бяспеку ўсіх асоб, у тым ліку асоб, якія падазраюцца ў злачынстве. У прыватнасці, 4-ты прынцып гаворыць, што службовыя асобы могуць прымяняць сілу толькі ў выпадку скрайняй неабходнасці і ў памеры, неабходным для выканання іх абавязкаў. Яны павінны па магчымасці ўжываць негвалтоўныя сродкі. Што тычыцца міліцэйскага кантролю над правядзеннем сходаў, Асноўныя прынцыпы ААН падкрэсліваюць права на мірныя сходы. Прынцып 13 абвяшчае, што ў “разгоне супрацьзаконных сходаў, але негвалтоўных, супрацоўнікі праваахоўных органаў павінны пазбягаць прымянення сілы або, калі гэта немагчыма, абмяжоўваюць такое прымяненне да неабходнага мінімуму”. Акрамя таго, 7-ы прынцып патрабуе ад урада забяспечыць, каб любое адвольнае або наўмыснае прымяненне сілы супрацоўнікамі праваахоўных органаў пераследвалася як крымінальнае злачынства.

Закон Міністэрства ўнутраных спраў аб унутраных войсках паведамляе, што супрацоўнікі праваахоўных органаў могуць ўжываць сілу толькі тады, калі гэта непазбежна, каб спыніць масавыя беспарадкі і знішчэнне маёмасці і арыштаваць падазраваных, якія супраціўляюцца міліцыі. Яны павінны прыняць усе магчымыя меры для забеспячэння бяспекі грамадзян і “нанесці як мага меншую шкоду іх здароўю, гонару, годнасці і маёмасці, па неабходнасці”. Закон таксама дазваляе супрацоўнікам праваахоўных органаў ужываць сілу “ў іншых абставінах, вызначаных Прэзідэнтам”.

# МАЯ АБРОМЧЫК

*"Я не разумею чаму, або за што мы былі збітыя".*
Мая Абромчык



Мая Абромчык у шпіталі 22 снежня 2010 © Aliaksandr Piletski

Мая Абромчык, 21-гадовая студэнтка, расказала "Міжнароднай Амністыі", што яна не прысутнічала падчас дэманстрацыі 19 снежня 2010 года. Але каля 12 ночы 19 снежня 2010 года яна і яе сябры вырашылі пайсці і паглядзець, што адбываецца. Яны праходзілі побач з плошчай Незалежнасці, якая была ачэплена міліцыяй, і некалькі чалавек прайшлі за кардон. Раптам Мая і яе сябры апынуліся перад трыма супрацоўнікамі праваахоўных органаў, якія выглядалі вельмі злосна. Адзін з іх сказаў: "Цяпер мы збіраемся паказаць вам тое, што вы прыйшлі ўбачыць" і пачалі збіваць дубінкай аднаго з сяброў Маі, выкрыкваючы "Ідзі ў міліцэйскі фургон!". Калі Мая папрасіла афіцэра спыніць збіццё яе сябра, адзін з іх пачаў біць яе сваёй дубінкай. Яна ўпала і не змагла падняцца. Калі афіцэр загадаў ёй устаць і пайсці ў фургон, яе туды перанесліа сябры. Нягледзячы на просьбу аб медыцынскай дапамозе, Мая правяла наступныя дзве з паловай гадзіны ў міліцэйскім фургоне, які пераязджаў з аднаго следчага ізалятара ў іншы. Урэшце была выклікана хуткая дапамога, і Маю адвезлі ў бальніцу. У яе была раздробленая галёначная костка, на наступны дзень яна была прааперавана. Поўнае аднаўленне заняло цэлы год, яна перанесла тры аперацыі. Бацькі Маі адразу ж звярнуліся са скаргай да Генеральнага пракурора аб збіцці іх дачкі. У красавіку 2011 года пракурор Маскоўскага раёна горада Мінска паведаміў ёй, што крымінальная справа была ўзбуджаная ў дачыненні да нявызначанай асобы. Міліцыя ў справе не фігуравала, хоць згодна з судова-медыцынскай экспертызай, праведзенай па просьбе пракуратуры, траўмы маглі быць нанесены чымсьці падобным да міліцэйскай дубінкі. На сённяшні дзень справа знаходзіцца на разглядзе Камітэта ААН па правах чалавека.

“Міжнародная Амністыя” заклікае беларускія ўлады забяспечыць, каб усе сцвярджэнні аб непатрэбным або празмерным прымяненні сілы супрацоўнікамі праваахоўных органаў расследаваліся аператыўна і справядліва, а вінаватыя асобы неслі адпаведную дысцыплінарную і крымінальную адказнасць. Любы супрацоўнік праваахоўных органаў, які абгрунтавана падазраецца ў адказнасці за адвольнае або наўмыснае прымяненне сілы, павінен быць прыцягнуты да адказнасці ў судовым парадку, які адпавядае міжнародным стандартам справядлівага судовага разбору са штрафамі, адпаведнымі цяжкасці злачынства, не звяртаючыся да смяротнага пакарання. Старэйшыя па званні службовыя асобы павінны несці адказнасць, калі яны ведалі або павінны былі ведаць, што супрацоўнікі, якія знаходзяцца пад іх камандаваннем, незаконна ўжывалі сілу, і яны не прынялі ўсіх неабходных мер для прадухілення, спынення такіх выпадкаў або не паведамілі пра іх. Ахвярам незаконнага прымянення сілы супрацоўнікамі праваахоўных органаў, незалежна ад таго, прызнаныя яны вінаватымі або пераследваюцца судом, павінна забяспечвацца пакрыццё шкоды, уключаючы кампенсацыю.

## 4.6 ПАЛІТЫЧНА МАТЫВАВАНЫ КРЫМІНАЛЬНЫ ПЕРАСЛЕД

Пасля дэманстрацыі ў Мінску пасля прэзідэнцкіх выбараў у 2010 годзе каля 40 чалавек былі абвінавачаныя ў крымінальных злачынствах. Сярод абвінавачаных былі шэсць з сямі апазіцыйных кандыдатаў у прэзідэнты; многім вядучым журналістам і актывістам апазіцыі былі прад'яўлены абвінавачванні ў “арганізацыі масавых беспарадкаў” і “грубым парушэнні грамадскага парадку”, яны былі асуджаны да турэмнага зняволення на тэрмін да шасці гадоў. Некаторыя з іх атрымалі ўмоўныя тэрміны, а некаторыя былі вызвалены да сканчэння тэрміну пакарання. Ужо мінулі два гады, як чатыры чалавекі – Мікалай Статкевіч, Павел Севярынец, Эдуард Лобаў і Зміцер Дашкевіч – застаюцца ў турмах і працоўных калоніях з-за сувязі з падзеямі снежня 2010 года. Іншыя дагэтуль адбываюць умоўнае пакаранне і жывуць пад пастаянным наглядам, маюць абмежаванні на паездкі, а некаторыя збеглі з краіны пасля адбыцця пакарання і папрасілі палітычны прытулак за мяжой.

Кіруючыя прынцыпы АБСЕ па свабодзе мірных сходаў гавораць, што арганізатары сходаў не павінны несці адказнасць за неправамерныя дзеянні асобных удзельнікаў ці *правакатараў.* Але любы чалавек, які здзейсніў злачынства, павінен быць прыцягнуты да адказнасці[49]. Спецыяльны дакладчык ААН па правах на свабоду мірных сходаў і асацыяцый таксама падкрэсліў, што арганізатары і ўдзельнікі сходаў не павінны несці адказнасць за агрэсіўныя паводзіны іншых людзей.[50]

“Міжнародная Амністыя” не знайшла доказаў таго, што апазіцыйныя кандыдаты ў прэзідэнты, якія былі асуджаныя за арганізацыю масавых беспарадкаў, звярталіся або падбухторвалі да ўжывання гвалту да ці падчас дэманстрацыі. Большасць палітыкаў стаялі на некаторай адлегласці ад групы, якая разбівала вокны і дзверы будынка парламента. Адзін з відавочцаў паведаміў, што адзін з затрыманых кандыдатаў у прэзідэнты, Мікалай Статкевіч, звярнуўся да натоўпу, каб спыніць разбурэнне дзвярэй у будынку парламента. Відэазапіс паказвае, што кандыдат у прэзідэнты Віталь Рымашэўскі спрабаваў спыніць людзей, якія чынілі шкоду будынку.

# МІКАЛАЙ СТАТКЕВІЧ

**Мікалай Статкевіч балатаваўся як незалежны апазіцыйны кандыдат у прэзідэнты. 26 мая 2011 года ён быў прысуджаны да прымусовай працы на шэсць гадоў за “арганізацыю масавых беспарадкаў”. Пагэтуль застаецца ў турме.**

У студзені 2012 года ён быў пераведзены з папраўчай калоніі № 17 у Шклове, дзе ён працаваў на лесапільным заводзе, у турму строгага рэжыму № 4 у Магілёве па абвінавачванні ў парушэнні правілаў калоніі. Адміністрацыя калоніі сцвярджала, што Статкевіч быў схільны да гвалту і ўцёкаў. З 6 па 16 ліпеня 2012 года ён быў змешчаны ў карцар нібыта за адмову прасіць Прэзідэнта аб памілаванні. Жонка Статкевіча, Марына Адамовіч, мае права наведваць яго толькі адзін раз за год і працягласцю не болей за чатыры гадзіны, яна таксама мае права толькі на адзін тэлефонны званок у месяц.

“Гэтыя званкі заўсёды нечаканыя, хоць я ўвесь час чакаю іх”, кажа яна. “У мінулы раз адвакат папярэдзіў мяне, але гэта было ўсё яшчэ як шок. Вы кажаце пра няважныя рэчы, а ён спрабуе сказаць, што ўсё ў парадку, або спрабуе перадаць інфармацыю, якая важная для іншых зняволеных ... Гэта процьма эмоцый і велізарная радасць”.

Мінула больш за два гады з падзеяў снежня 2010 года, але Мікалай Статкевіч, Павел Севярынец, Эдуард Лобаў і Зміцер Дашкевіч дагэтуль зняволеныя ў сувязі з тымі падзеямі. “Міжнародная Амністыя” лічыць іх вязнямі сумлення, якія былі асуджаныя па палітычна матываваных абвінавачваннях у парушэнне іх права на свабоду выказвання і свабоду мірных сходаў, і заклікае да іх неадкладнага і безумоўнага вызвалення.

# 5. ПРАВААБАРОНЦЫ

## “Кожны чалавек мае права індывідуальна і сумесна з іншымі заахвочваць і імкнуцца абараняць і ажыццяўляць правы чалавека і асноўныя свабоды на нацыянальным і міжнародным узроўнях”.

Артыкул 1 Дэкларацыі аб праве і абавязку асобных асоб, груп і органаў грамадства заахвочваць і абараняць агульнапрызнаныя правы чалавека і асноўныя свабоды.

Асаблівую актуальнасць для арганізацый і прыватных асоб, якія працуюць у галіне правоў чалавека, мае Дэкларацыя ААН аб праве і абавязку асобных асоб, груп і органаў грамадства заахвочваць і абараняць агульнапрызнаныя правы чалавека і асноўныя свабоды (Дэкларацыя аб праваабаронцах), прынятая рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі 53/144 9 снежня 1998 года, якая патрабуе, каб улада абараняла правы, неабходныя для працы праваабаронцаў. Хоць сама па сабе яна не з’яўляецца юрыдычна абавязковым дакументам, Дэкларацыя змяшчае правы, якія прызнаныя ў шматлікіх юрыдычна абавязковых міжнародных дакументах па правах чалавека, у тым ліку МПГПП, яна была прынята кансэнсусам Генеральнай Асамблеі, які прадстаўляе цвёрдую прыхільнасць дзяржавы да яе ажыццяўлення. Здольнасць ажыццяўляць права на свабоду выказвання, у тым ліку права атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і права мірных сходаў, а таксама магчымасць для правядзення калектыўных дзеянняў і мірнай прапаганды зменаў, мець зносіны з нацыянальнымі і міжнароднымі арганізацыямі – усё гэта мае важнае значэнне для абароны правоў чалавека.

Абаронцы правоў чалавека часта падвяргаюць сябе рызыцы, крытыкуючы дзяржаву ці іншых уплывовых асоб. Таму ўрад абавязаны забяспечыць, каб яны маглі выконваць сваю працу без перашкод, дыскрымінацыі ці страху помсты. Любы праваабаронца, правы якога парушаны, мае права падаць скаргу, якая мусіць быць разгледжана незалежным, непрадузятым і кампетэнтным судовым ці іншым органам, і ў выпадку выяўлення парушэння, атрымаць кампенсацыю.

Абаронцы правоў чалавека ў Беларусі працуюць у надзвычай складаных умовах. Яны могуць быць падвергнутыя крымінальнаму пераследу за сваю працу або за спробу зарэгістраваць сваю арганізацыю. Яны сутыкаюцца з рознымі формамі дамаганняў, уключна з вобшукамі, канфіскацыяй маёмасці і допытамі ў КДБ, а таксама адміністрацыйным пераследам і падатковымі расследаваннямі. Усё гэта ўскладняе іх працу.[51] Нягледзячы на гэтыя цяжкасці, яны працягваюць мець неацэнную ролю ў дакументаванні парушэнняў правоў чалавека, аказваючы прававую дапамогу насельніцтву, і робяць усё магчымае, каб уплываць на афіцыйную палітыку і практыку ў галіне правоў чалавека.

## 5.1 КРЫМІНАЛЬНЫ ПЕРАСЛЕД

Адсутнасць бесстаронняга судовага пераследу і незалежнай судовай улады спрыяе асуджэнню і пазбаўленню волі па палітычна матываваных абвінавачваннях выбітных абаронцаў правоў чалавека. Алесь Бяляцкі, старшыня праваабарончага цэнтра "Вясна", заплаціў вельмі высокую цану за сваю дзейнасць у вобласці правоў чалавека.

### АЛЕСЬ БЯЛЯЦКІ

*"Чаму вы падпісалі Дэкларацыю? Калі б толькі вы не падпісалі! Пакіньце ААН, пакіньце АБСЕ! Тады ўсё будзе ясна".*

Алесь Бяляцкі, яго заключнае слове на судзе 24 лістапада 2011 года, спасылаючыся на Дэкларацыю ААН аб праваабаронцах.




©svaboda.org

Алесь Бяляцкі, старшыня незарэгістраванай арганізацыі па правах чалавека "Праваабарончы цэнтр "Вясна"і віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі па правах чалавека, быў затрыманы ў цэнтры Мінска 4 жніўня 2011 года. 24 лістапада ён

быў асуджаны да чатырох з паловай гадоў па абвінавачванні ва “ўтойванні даходаў у буйным памеры” (арт. 243.2 Крымінальнага кодэкса Беларусі). Суд у некалькіх месцах парушыў міжнародныя стандарты справядлівага судовага разбору, “Міжнародная Амністыя” лічыць, што абвінавачванні і яго заключэнне з’яўляюцца палітычна матываванымі і прызначаныя, каб перашкодзіць яго законнай працы ў якасці абаронцы правоў чалавека. “Міжнародная Амністыя” лічыць, што Алесь Бяляцкі з’яўляецца вязнем сумлення, пазбаўленым свабоды выключна з-за яго працы ў галіне правоў чалавека.

Алесь Бяляцкі быў арыштаваны за выкарыстанне свайго асабістага банкаўскага рахунку ў Літве і Польшчы ў падтрымку дзейнасці сваёй праваабарончай арганізацыі ў Беларусі. Пасля пазбаўлення рэгістрацыі (гл. с. 17-18) праваабарончаму цэнтру “Вясна” было адмоўлена ў адкрыцці банкаўскага рахунку ад свайго імя ў Беларусі, і ў членаў “Вясны” не было іншага выбару, акрамя як выкарыстоўваць банкаўскія рахункі ў суседніх краінах, каб фінансаваць сваю дзейнасць.

Падчас суда мелі месца пэўныя працэсуальныя парушэнні, што паказваюць на яго палітычны характар. Допыт сведак часта быў супастаўны не з абвінавачваннямі, а з дзейнасцю ў галіне правоў чалавека Алеся Бяляцкага і саміх сведак. Некалькіх вядомых праваабаронцаў і членаў Праваабарончага цэнтра “Вясна” дапытвалі ў сувязі са справай. Доказы, прадстаўленыя бокам абвінавачвання, уключалі копіі выпіскі з банкаўскіх рахункаў, якія не былі засведчаныя, а некаторыя дакументы былі прадстаўленыя як атрыманыя ад ананімных інфарматараў, што парушае дзейную працэдуру судовага разбору. Акрамя таго, дзяржаўныя абвінаваўцы ў Беларусі запыталі інфармацыю ад польскіх і літоўскіх банкаў перад узбуджэннем крымінальнай справы ў дачыненні да Алеся Бяляцкага, парушуючы пагадненні паміж гэтымі краінамі датычна абмену інфармацыяй па крымінальных справах. Літоўскае Міністэрства юстыцыі і польскія ўлады перадалі гэту банкаўскую інфармацыю беларускім уладам. Тым не менш, польскія і літоўскія чыноўнікі публічна папрасілі прабачэння перад Алесем Бяляцкім і яго сям’ёй за прадастаўленне інфармацыі беларускай уладзе. Гэтыя дзве краіны таксама прыпынілі двухбаковыя дамовы аб прававой дапамозе па выкарыстанні інфармацыі з Беларуссю.

Пакаранне ўключае аплату штрафу і канфіскацыю маёмасці, у тым ліку кватэры, дзе жывуць жонка і сын Алеся Бяляцкага, якія з’яўляюцца яе суўладальнікамі, і кватэры, дзе знаходзіўся офіс праваабарончага цэнтра “Вясна”. Офіс быў канфіскаваны 26 лістапада 2012 года.

29 лістапада 2011 года адвакат Алеся Бяляцкага падаў апеляцыю ў Мінскі гарадскі суд. 24 студзеня 2012 года суд адхіліў апеляцыю і пакінуў у сіле рашэнне суда першай інстанцыі.

Іншыя праваабаронцы знаходзяцца пад пагрозай крымінальнага пераследу за законнае ажыццяўленне свайго права на свабоду выказвання меркавання. Пасля звароту НДА “Платформа” да Міжнароднай федэрацыі хакея з заклікам устрымацца ад правядзення ў 2014 годзе Чэмпіянату свету па хакеі ў Беларусі, пакуль усе палітычныя

зняволеныя не будуць вызваленыя, старшыня арганізацыі Андрэй Бандарэнка атрымаў папярэджанне ад Мінскай гарадской пракуратуры аб тым, што яму пагражае крымінальны пераслед у адпаведнасці з артыкулам 369.1 за "дыскрэдытацыю Рэспублікі Беларусь шляхам распаўсюду заведама лжывых звестак аб палітычным і сацыяльным становішчы Рэспублікі Беларусь і / або прававога статусу грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія дыскрэдытуюць Рэспубліку Беларусь або яе органы". У ліпені КДБ паведаміў Андрэю Бандарэнку, што ён быў уключаны ў спіс патэнцыйных правапарушальнікаў ў сферы ўплыву КДБ.[52]

## 5.2 УЦІСК

У дадатак да крымінальнага і адміністрацыйнага пераследу і пагрозаў крымінальнага пераследу абаронцы правоў чалавека сутыкаюцца з рознымі іншымі формамі ціску, у тым ліку з падатковымі патрабаваннямі і абмежаваннямі на паездкі.

### 5.2.1 ПАДАТКОВЫЯ ПАТРАБАВАННІ

"Міжнародная Амністыя" прызнае, што ўлада мае законнае права атрымліваць справаздачы аб даходах або іншых актывах, якія абкладаюцца падаткамі, і даследаваць іх. Тым не менш, частата, з якой абаронцы правоў чалавека былі даследаваны падатковым органам гаворыць аб тым, што патрабаванні былі звязаныя з іх дзейнасцю, а не з законнымі падатковымі патрабаваннямі. Артыкул 12 "Закона аб падатковых дэкларацыях фізічных асоб Рэспублікі Беларусь" абвяшчае, што просьбы аб падаванні падатковых дэкларацый могуць быць зробленыя па патрабаванні КДБ.[53] Гэта азначае, што падатковыя органы могуць прад'яўляць патрабаванні да падатковай дэкларацыі, якая інакш не патрабуецца ў адпаведнасці з падатковым заканадаўствам. Звяртае на сябе ўвагу колькасць актывістаў у галіне правоў чалавека, якія ў 2012 годзе былі падвергнутыя патрабаванням ад падатковых органаў, які адымаюць шмат часу. У верасні 2012 года тром вядомым праваабаронцам было прапанавана прадставіць падатковыя дэкларацыі, якія ахопліваюць шмат гадоў. Алег Воўчак, былы дырэктар праваабарончай арганізацыі "Прававая дапамога насельніцтву", якая была ліквідавана ў 2003 годзе, атрымаў запыт ад Міністэрства па падатках і зборах на адпраўку асабістых падатковых дэкларацый за апошнія 10 гадоў. 21 верасня 2012 года Таццяне Равяка, члену савета праваабарончага цэнтра "Вясна", было прапанавана прадставіць падатковыя дэкларацыі за апошнія сем гадоў. 27 верасня Леаніду Судаленку, праваабаронцу з Гомеля, было прапанавана прадставіць падатковыя дэкларацыі за апошнія пяць гадоў. Яго жонка і сын таксама атрымалі аналагічныя патрабаванні. Леанід Судаленка лічыць, што ўвага падатковых органаў была звязана з тым, што ён быў вельмі актыўным падчас парламенцкіх выбараў у аказанні дапамогі кандыдатам, якім было адмоўлена ў рэгістрацыі. Дагэтуль прапанова прадставіць дэкларацыю паступала пасля парламенцкіх выбараў 2008 года, на якіх ён таксама быў актыўным.

## БЕЛАРУСКІ ХЕЛЬСІНКСКІ КАМІТЭТ

*"Гэта ўсё вісіць над намі, і ў любы момант яны могуць прыйсці да нас з падатковымі патрабаваннямі".*

Алег Гулак, старшыня Беларускага Хельсінкскага камітэта.

З Беларускага Хельсінкскага камітэта (БХК) падатковыя органы па-ранейшаму хочуць спагнаць штраф ў памеры 284 мільёны беларускіх рублёў ($ 180 000), які быў накладзены ў студзені 2004 года. Падатковыя органы абвінавачваюць БХК у

выкарыстанні гранта, прадастаўленага праграмай TACIC Еўрапейскага саюза без рэгістрацыі замежнай гуманітарнай дапамогі і без выплаты падаткаў на яе ў адпаведнасці з правіламі Дэкрэта Прэзідэнта № 8 ад 1999 года. На самой справе міжнародная тэхнічная дапамога рэгулюецца міжнароднымі пагадненнямі паміж урадам Беларусі і Еўрапейскай камісіяй, якія сцвярджаюць, што такая дапамога не падлягае падаткаабкладанню. БХК абскардзіў рашэнне падатковых органаў. 23 чэрвеня 2004 года Мінскі Гаспадарчы суд адмяніў гэтае рашэнне. Пастанова суда была падтрымана апеляцыйным судом і пракуратурай. Тым не менш, напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2006 года намеснік старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда апратэставаў папярэдняе судовае рашэнне па гэтай справе ў 2004 годзе, і Савет Вышэйшага Гаспадарчага Суда задаволіў пратэст. Затым Міністэрства па падатках і зборах канфіскавала маёмасць БХК на суму 255 мільёнаў рублёў (на той час эквівалент € 23 000). 28 жніўня 2007 года БХК пачаў грамадзянскую цяжбу з Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь у Вышэйшым Гаспадарчы Судзе з патрабаваннем кампенсацыі за страчаную маёмасць у памеры да 255 мільёнаў рублёў. БХК спаслаўся на міжнародныя дамовы, у якіх гаворыцца, што тэхнічная дапамога з боку ЕС не падлягае падаткаабкладанню. Гэта справа была закрыта на той падставе, што Савет Міністраў не з'яўляецца юрыдычнай асобай.

У чэрвені 2011 года Міністэрства юстыцыі вынесла пісьмовае папярэджанне БХК за "працяглыя парушэнні падатковага заканадаўства". 25 лютага 2013 года супрацоўнікі Міністэрства па падатках і зборах наведалі офіс БХК у Мінску без папярэдняга апавяшчэння і перадалі кіраўніку арганізацыі Алегу Гулаку ордэр на арышт маёмасці ў аплату падатку. Аднак чыноўнікі не змаглі знайсці ў офісе якую-небудзь маёмасць для канфіскацыі, бо ўся мэбля ў офісе была ўзята ў крэдыт ад АБСЕ, а ўсе кампутары былі асабістымі ноўтбукамі.

"Міжнародная Амністыя" заклікае беларускія ўлады забяспечыць, каб падатковыя расследаванні не праводзіліся рэпрэсіўным чынамзм этай абмежавання ажыццяўлення права на свабоду аб'яднанняў. Яны павінны ажыццяўляцца ў адпаведнасці з дзейным заканадаўствам і міжнароднымі абавязкамі па забеспячэнні права на свабоду аб'яднанняў.

### 5.2.2 АБМЕЖАВАННЕ ПАЕЗДАК

У сакавіку 2012 года па меншай меры 15 праваабаронцаў, палітычных актывістаў і журналістаў былі змешчаны ў чорны спіс тых, каму забаронена пакідаць краіну. У спіс увайшлі старшыні ўсіх асноўных груп праваабаронцаў: Валянцін Стэфановіч, праваабарончы цэнтр "Вясна"; Алег Гулак, БХК; Андрэй Бандарэнка, "Платформа"; Алег Воўчак, "Прававая дапамога насельніцтву", а таксама выбітныя апазіцыйныя палітыкі і журналісты: Жанна Літвіна, старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў, і Андрэй Дынько, галоўны рэдактар незалежнай газеты "Наша ніва".[54] Усе забароны былі паспяхова адмененыя ў апеляцыйнай інстанцыі ў судах, а іх з'яўленне было патлумачана нібыта "кампутарнай памылкай".

## КАМПУТАРНАЯ ПАМЫЛКА

*“У мяне няма ніякіх ілюзій, што мы не сутыкнемся з іншымі “кампутарнымі памылкамі”, але раней ці пазней пакаранне за такія дзеянні будзе непазбежнае. Асабіста я не гатовы сысці ў адстаўку з-за выпадкаў такога відавочнага беззаконня”*

Андрэй Бандарэнка, заснавальнік і старшыня арганізацыі “Платформа”.

5 сакавіка 2012 года Андрэй Бандарэнка быў вымушаны пакінуць цягнік на польскай мяжы ў Брэсце і сказаў, што яго правы на выезд за мяжу былі часова абмежаваныя. Яму сказалі, што гэта было з-за яго нязгоды пайсці на ваенную службу, нягледзячы на тое, што ён па ўзросце не падыходзіў для прызыву на ваенную службу. Яго ноўтбук канфіскавалі службовыя асобы мытных органаў, якія сцвярджалі, што гэта было неабходна, каб зрабіць ацэнку ўтрымання ў ім любой інфармацыі, якая стварае пагрозу для Мытнага саюза [паміж Беларуссю, Казахстанам і Расіяй]. Андрэй Бандарэнка абскардзіў забарону, і на судовым паседжанні 22 чэрвеня 2012 года яму паведамілі, што забарона была выдадзена з-за “кампутарнай памылкі”. Андрэю Бандарэнку неафіцыйна паказалі файл, які дакументальна пацвярджаў, што яго імя было выдалена са спісу забароны на паездкі 5 сакавіка (адразу пасля таго, як яго спынілі на мяжы), аднак ён не быў праінфармаваны пра гэта афіцыйна. Ноўтбук Андрэю Бандарэнку вярнулі ў сакавіку 2013 года, крыху больш, чым праз год пасля канфіскацыі.

“Міжнародная Амністыя” заклікае беларускія ўлады прызнаць легітымнасць працы праваабаронцаў, а таксама забяспечыць асяроддзе, у якім магчыма абараняць правы чалавека, не баючыся рэпрэсій і запалохвання. Арганізацыя просіць ўлады зняць абмежаванні на паездкі і спыніць непатрэбныя і рэпрэсіўныя падатковыя праверкі ў дачыненні да абаронцаў правоў чалавека. Арганізацыя просіць ўрад Беларусі не чыніць перашкоды дзейнасці праваабаронцаў, выкарыстоўваючы крымінальнае правасуддзе, як гэта было ў выпадку з Алесем Бяляцкім, і просіць, каб ён быў вызвалены неадкладна і безумоўна.

# 6. НЕЗАЛЕЖНЫЯ ПРАФСАЮЗЫ

## “Стварэнне незалежнага прафсаюза... гэта не пратэст, гэта наша права, але на самой справе яно аказваецца пратэстам»”.

Алег Стахаевіч, які страціў працу за спробу стварэння незалежнага прафсаюза.

Рабочыя ў Беларусі сутыкаюцца з нізкай заработнай платай, дрэннымі ўмовамі і адсутнасцю гарантыі занятасці, але іх магчымасць змагацца за свае правы строга абмежавана.

У 1999 годзе Дэкрэт Прэзідэнта № 29 даў працадаўцам права складаць гадавыя кантракты з работнікамі. На самой справе гэта значыць, што тыя, хто працуе на кантраляваных дзяржавай прадпрыемствах і арганізацыях (каля 90% працоўнай сілы), падпісалі часовыя кантракты замест пастаянных. Як адзначыў Аляксандр Ярашук, кіраўнік Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў, “гэта была не эканамічная мера, а палітычны акт, накіраваны на падвышэнне кантролю дзяржавы над насельніцтвам”.[55] Гэтая выснова пацвярджаецца тым фактам, што з таго часу “Міжнародная Амністыя” зафіксавала выпадкі, калі з працаўнікамі не падаўжалі кантракты, калі яны ўзялі ўдзел у несанкцыянаваных мітынгах.

Зусім нядаўна ў 2012 годзе Дэкрэт Прэзідэнта № 9 “Аб дадатковых мерах па развіцці лесаперапрацоўчай прамысловасці” падкрэсліў, што кантракты могуць быць разарваныя толькі са згоды працадаўцы і могуць быць падоўжаныя на нявызначаны тэрмін падчас інвестыцыйных праектаў. Дэкрэт быў прызначаны для барацьбы з той праблемай, што індустрыя перапрацоўкі драўніны ў Беларусі не ў стане захаваць рабочых, якія едуць працаваць у Расію, дзе больш высокія заробкі. Гэта можа прывесці да парушэння правоў работнікаў замацаваных у артыкуле 6 Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (МПЭСКП), які гарантуе права на працу і ўключае ў сябе “права кожнага чалавека на атрыманне магчымасці зарабляць сабе на жыццё працай, якую ён свабодна выбірае або прымае”.

Беларусь далучылася да Міжнароднай арганізацыі працы (МАП) у 1954 годзе і з’яўляецца дзяржавай-удзельніцай усіх асноўных канвенцый МАП. У прыватнасці, Канвенцыі аб свабодзе аб’яднанняў і абароне права на арганізацыю і Канвенцыі аб

праве на арганізацыю і на вядзенне калектыўных перамоваў з 1956 года.

МАП неаднаразова звяртала ўвагу на парушэнне права на свабоду сходаў і аб'яднанняў у Беларусі. У 2004 годзе МАП апублікавала даклад Камісіі па расследаванні, прызначанай пасля шматлікіх скаргаў беларускіх прафсаюзаў.[56] У дакладзе ўтрымліваецца заклік да зменаў у сістэме працоўных адносін у Беларусі для забеспячэння роўнага ўдзелу незалежных прафсаюзаў, прапануюцца меры па пераадоленні парушэнняў правоў на свабоду сходаў і аб'яднанняў, уключна са зменамі ў Закон аб масавых мерапрыемствах і ў Дэкрэт Прэзідэнта № 2, які зрабіў патрабаванні да рэгістрацыі прафсаюзаў больш жорсткімі. 21 чэрвеня 2007 года пасля ацэнкі МАП, што Беларусь не адрэагавала адэкватна на рэкамендацыі Камісіі па расследаванні, Еўрапейская камісія выключыла Беларусь з Усеагульнай сістэмы прэферэнцый Еўрапейскага саюза (УСП).[57] У выніку гэтага мытныя тарыфы для беларускіх тавараў, што ўвозяцца ў ЕС, павялічыліся прыкладна на тры працэнты.

У краіне ёсць два асноўныя прафсаюзныя органы: Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі (ФПБ) з чатырма мільёнамі членаў, а таксама Беларускі кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП), які быў створаны ў 1993 годзе для аб'яднання большасці незалежных прафсаюзаў, і мае ў сваім складзе 10 000 членаў. Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі з'яўляецца правапераемнікам Савета прафсаюзаў БССР. МАП адзначыў, што "сістэма працоўных адносін у Беларусі і практыка прафсаюзаў па-ранейшаму захоўваюць многія рысы савецкага перыяду, асабліва што тычыцца ўдзелу кіраўнікоў і прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, у тым ліку міністраў і іх намеснікаў, непасрэдна ў прыняцці рашэнняў прафсаюзных органаў".[58] "Незалежныя прафсаюзныя актывісты адзначылі, што нельга сказаць, што афіцыйныя прафсаюзы нічога не робяць для абароны правоў рабочых, але яны маўчаць пра афіцыйную палітыку, якая парушае правы працаўнікоў, і яны не могуць эфектыўна абараняць правы працаўнікоў на ўзроўні прадпрыемства. Як і ў савецкія часы, доля супрацоўнікаў, якія ўступілі ў афіцыйны прафсаюзны рух, надзвычай высокая. Членамі ФПБ з'яўляюцца 99% работнікаў спажывецкай кааперацыі, 98,4% падатковых і фінансавых работнікаў і 98,2% работнікаў нафта-газавага сектара.[59]

Беларускі кангрэс Дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП) з'яўляецца членам Міжнароднай канфедэрацыі прафсаюзаў з 2007 года. Дзякуючы міжнароднаму ціску з боку МАП і ЕС, БКДП прыняў удзел у трохбаковым Нацыянальным камітэце па працоўных і сацыяльных пытаннях. Гэта вялікае дасягненне ў краіне, дзе кожнага, хто лічыцца праціўнікам улады, выключаюць з палітычнага працэсу.

## ЗАБАРОНА АДЗІНОЧНАГА ПІКЕТА


© Правозащитный центр «Вясна»

**Аляксандр Дзенісенка**, член незалежнага Беларускага прафсаюза работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці (РЭП) атрымаў адмову ад мясцовых уладаў на запыт правесці 17 сакавіка 2012 года ў Брэсце пікет з удзелам аднаго чалавека на знак пратэсту супраць высокага кошту жылля. Адмова была зроблена на той падставе, што ў яго не было дамовы з

міліцыяй, хуткай дапамогай і мясцовай уладай, каб забяспечыць ўборку і сродкі гігіены. Аляксандр Дзенісенка абскардзіў рашэнне мясцовай улады ў судзе першай інстанцыі, апеляцыйным судзе, акруговым судзе і Вярхоўным Судзе, паўсюль рашэнне мясцовай улады было падтрымана. Справа ў цяперашні момант знаходзіцца на разглядзе Камітэта ААН па правах чалавека.

## 6.1 ЦЯЖКАСЦЬ РЭГІСТРАЦЫІ

> *"Для нас вельмі важна, каб гэты ўказ прайшоў, і каб прафсаюзы маглі нармальна функцыянаваць"*
> Генадзь Фядыніч, Беларускі прафсаюз работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці.

Афіцыйныя прафсаюзы ў Беларусі вельмі цесна супрацоўнічаюць з працадаўцамі і ўрадам, як і ў савецкі час. Некаторыя працаўнікі імкнуцца стварыць незалежныя прафсаюзы, бо, па іх меркаванні, яны лепш прадстаўляюць іх інтарэсы. Тыя, хто спрабуюць гэта зрабіць, сутыкаюцца з тым, што іх спробы блакіруюць варожа настроеныя працадаўцы і мясцовыя органы ўлады, а таксама існуюць надзвычай патрабавальныя працэдуры для рэгістрацыі аб'яднанняў. Незалежныя прафсаюзы, якія спрабуюць стварыць на буйных дзяржаўных прадпрыемствах, сутыкаюцца з асаблівым ціскам з боку працадаўцаў і мясцовых органаў улады. Дэкрэт Прэзідэнта № 2 ад 1999 года патрабуе, каб усе раней зарэгістраваныя прафсаюзы перарэгістраваліся. Ён увёў патрабаванне юрыдычнага адрасу для рэгістрацыі прафсаюза, чаго раней не было. Дзяржаўныя прадпрыемствы, як звычай, вельмі неахвотна даюць памяшканні незалежным прафсаюзам. Прафсаюзныя актывісты, якія спрабуюць знайсці памяшканне ў іншым месцы ў горадзе, высвятляюць, што на прыватных ўладальнікаў аказваюць ціск улады, каб тыя адмовіліся прадастаўляць прафсаюзам памяшканні ў арэнду. У сваім дакладзе аб сітуацыі ў Беларусі Камітэт МАП па свабодзе аб'яднанняў заклікае ўлады Беларусі ўнесці папраўкі ў Дэкрэт Прэзідэнта № 2 ад 1999 года і "забяспечыць, каб эфектыўна гарантаваліся правы на аб'яднанне".[60]

Нават калі незалежны прафсаюз зарэгістраваны на нацыянальным узроўні, ён можа сутыкнуцца з іншымі перашкодамі. Напрыклад, Прафсаюз радыёэлектроннай прамысловасці (РЭП), які ўваходзіць у склад БКДП, зарэгістраваны на нацыянальным узроўні, але з 2004 года мясцовымі органамі ўлады была адхілена 41 заяўка на рэгістрацыю рэгіянальных аддзяленняў.

## 6.2 ДЫСКРЫМІНАЦЫЯ ЧЛЕНАЎ ПРАФСАЮЗА

Гісторыя пра тое, як працаўнікі дзяржаўнага кар'ера "Граніт" у Мікашэвічах спрабавалі стварыць філіял незалежнага прафсаюза, не толькі сведчыць пра дыскрымінацыю, з якой сутыкаюцца члены незалежнага прафсаюза, але і пра тое, што працадаўцы, мясцовыя органы ўлады і суды працуюць разам, каб аказаць ціск на незалежныя прафсаюзы.

# "ГРАНІТ"

*"Усё звязана зверху ўніз, і вы не можаце нічога зрабіць без дазволу паўнамоцтваў зверху".*
Член незалежнага прафсаюзу гранітнага кар'ера "Граніт"[61]

24 снежня 2011 года больш 200 рабочых гранітнага кар'ера "Граніт" у г.п. Мікашэвічы Брэсцкай вобласці Беларусі ўдзельнічалі ва ўстаноўчым сходзе незалежнай прафсаюзнай арганізацыі як часткі БКДП. Алег Стахаевіч, вадзіцель кампаніі, быў абраны прэзідэнтам мясцовага аддзялення прафсаюза. Як ён патлумачыў "Міжнароднай Амністыі", сход быў бы сарваны, калі б заснавальнікі не чакалі рэакцыі ўлады і зрабілі альтэрнатыўныя сакрэтныя планы:

"Спачатку мы планавалі правесці сустрэчу ў цэнтральным доме культуры, але калі мы дабраліся туды, нас чакала адміністрацыя фабрыкі і міліцыянеры. Мы ўжо запланавалі гэта, усе селі ў машыны і паехалі ў вёску. Яны думалі, што мы толькі што пайшлі дадому. Мы нікому не казалі, што мы запланавалі, і яны не ведалі, куды мы ідзем".

Яны правялі свой ўстаноўчы сход і ў адпаведнасці з заканадаўствам накіравалі ліст працадаўцу, каб праінфармаваць яго пра стварэнне першаснага прафсаюза, і папрасілі прадаставіць юрыдычны адрас. Кампанія адмовілася даць адрас, сцвярджаючы, што яна не атрымала поўнага камплекта дакументаў. Тады прафсаюз звярнуўся ў Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва і Міністэрства юстыцыі і папрасіў у іх дапамогі ў пошуку юрыдычнага адрасу, але безвынікова. Прафсаюз таксама спрабаваў арандаваць памяшканні ў прыватных арэндадаўцаў і ў мясцовага савета агенцтва нерухомасці. Савет агенцтва нерухомасці ім паведаміў, што ён ніколі не будзе прадастаўляць ім памяшкання, прыватныя домаўладальнікі адмовіліся здаваць аб'яднанню памяшканні ў арэнду, кажучы членам прафсаюза, што яны баяцца, каб іх бізнес не трапіў пад ціск з боку ўлады.

6 студзеня 2012 года старшыня выканкама Брэсцкай вобласці Канстанцін Сумар прысутнічаў на сустрэчы з рабочымі ў кар'еры, каб паведаміць, што ён папрасіў дырэктара прадпрыемства сысці ў адстаўку. Члены незалежнага прафсаюзу папрасілі кіраўніка вобласці ўмяшацца, каб прадухіліць пераслед тых, хто далучыўся да незалежнага прафсаюзу. У сваім адказе К.Сумар быў неадназначны. Гаворачы, што працаўнікі маюць права на ўступленне ў свабодны прафсаюз, ён таксама сказаў, што на прадпрыемстве павінен быць толькі адзін прафсаюз (афіцыйны). Калі ён выйшаў з пакоя, усе пачулі як ён сказаў: "Тут не будзе незалежнага прафсаюзу".[62]

Пасля спробы стварыць прафсаюз і візіта кіраўніка вобласці Алег Стахаевіч быў прыцягнуты да адказнасці за неасцярожнае кіраванне аўтамабілем, што, на яго думку, было сфабрыкаванай справай. 10 студзеня 2012 года дарожная міліцыя выклікала яго ў мясцовае аддзяленне, дзе ён даведаўся, што пазбаўлены свамх вадзіцельскіх правоў за небяспечнае кіраванне, таму што ён не змог спыніцца на перакрыжаванні перад пажылой жанчынай. 14 студзеня на пасяджэнні ў упраўленні дарожнай міліцыі ў раённым цэнтры Лунінец ён быў аштрафаваны і пазбаўлены правоў на кіраванне цяжкім грузавым аўтамабілем на шэсць месяцаў. Пешаход не даваў паказанні і быў невядомым. Відэа, на падставе якога ён быў асуджаны, паказала пешахода, які спакойна пераходзіў дарогу пасля таго, як прайшла яго машына. 16 лютага 2012 года ён быў праінфармаваны адміністрацыяй "Граніта" аб звальненні, але не атрымаў пісьмовага паведамлення. 17 лютага, калі ён прыбыў у начную змену, яго вывелі з памяшкання адвакат кампаніі і ўзброеныя ахоўнікі. Толькі 20 лютага яму паказаны пісьмовы загад аб звальненні, у якім гаварылася, што ён быў звольнены, таму

што ён “не падыходзіць для выканання абавязкаў, для якіх быў наняты”. Яго просьба перавясціся на месца малодшага свідроўшчыка была адхілена. 11 красавіка 2012 года яго зварот у суд Лунінецкага раёна супраць звальнення быў адхілены, 31 мая 2012 года далейшы зварот у Брэсцкі абласны суд быў таксама адхілены. На сённяшні дзень чатыры члены прафсаюза былі звольнены са сваіх працоўных месцаў. Іншыя былі запалоханы ці пакінулі прасаюз з-за страху страціць свае працоўныя месцы, зараз арганізацыя мае толькі адзінага афіцыйныйнага члена (сябра).

У дакладзе Камітэта МАП аб свабодзе аб’яднанняў Адміністрацыйны савет МАП звярнуўся да ўрада Беларусі, “каб звярнуць увагу на меркаваныя антыпрафсаюзныя звальненні”.[63]

“Міжнародная Амністыя” заклікае Беларусь выконваць свае абавязкі як дзяржавы-ўдзельніцы Канвенцыі МАП аб свабодзе аб’яднанняў і абароне права на арганізацыю і Канвенцыі аб праве на арганізацыю і на вядзенне калектыўных перамоваў на аснове павагі і забеспячэння права ствараць і ўступаць у незалежныя прафсаюзы, гарантуючы, што ўмовы, прыдатныя да стварэння і рэгістрацыі незалежных прафсаюзаў і прымянення нацыянальнага заканадаўства не эфектыўна абмяжоўваюць гэта права. Беларускія ўлады павінны ўнесці папраўкі ў Дэкрэт Прэзідэнта № 2 ад 1999 года, каб змяніць патрабаванні да юрыдычнага адрасу, каб гэта не перашкаджала членам незалежных прафсаюзных арганізацый ажыццяўляць свае правы на свабоду аб’яднанняў. У прыватнасці, “Міжнародная Амністыя” заклікае беларускія ўлады забяспечыць, каб прафсаюзы не падвяргаліся дыскрымінацыі, і заклікае ўрад да расследавання меркаванага звальнення Алега Стахаевіча за яго прафсаюзную дзейнасць.

# 7. ЭКАЛАГІЧНЫЯ АКТЫВІСТЫ

**“Нам трэба свабоднае абмеркаванне – калі мы маглі б абмяркоўваць гэтыя пытанні, грамадства было б зусім іншым”.**

Таццяна Новікава, экалагічная арганізацыя “Экадом”.

Абарона навакольнага асяроддзя з’яўляецца ключавым пытаннем, якое выклікае грамадскі інтарэс. Яно ўплывае на правы чалавека і якасць жыцця, і гэта мае асаблівае значэнне ў Беларусі, якая найбольш пацярпела ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Тым не менш, члены экалагічных кампаній сутыкаюцца з затрыманнем і пераследам за ажыццяўленне сваіх законных правоў на атрыманне і распаўсюд інфармацыі пра навакольнае асяроддзе. Катастрофа на Чарнобыльскай АЭС у 1986 годзе, якая знаходзіцца ў паўночнай частцы Украіны недалёка ад мяжы з Беларуссю, была адной з самых цяжкіх у гісторыі атамнай энергетыкі, яна непасрэдна закранула сотні тысяч чалавек. Дакладная колькасць людзей, чыё фізічнае здароўе пашкодзілася ў выніку катастрофы, невядома да гэтага часу, і многія іншыя людзі маюць псіхалагічныя наступствы. Траўмы і страх, спароджаныя аварыяй, пагаршаюцца няздольнасцю адэкватна праінфармаваць грамадскасць пра аварыю[64]. На працягу некалькіх дзён пасля гэтай падзеі ўрад СССР публічна не прызнаваў, што адбылася катастрофа, і наступная інфармацыя была строга абмежавана. Праз амаль трыццаць гадоў экалагічныя кампаніі ў Беларусі ўсё яшчэ змагаюцца, каб знайсці інфармацыю аб праектах, якія непасрэдна ўплываюць на іх жыццё, і не могуць публічна абмеркаваць свае праблемы.

Шэраг дагавораў і дэкларацый ААН прызнаюць важнасць навакольнага асяроддзя, і не толькі накладаюць на дзяржавы абавязкі па абароне навакольнага асяроддзя, а таксама падкрэсліваюць важнасць удзелу грамадскасці ў вырашэнні экалагічных пытанняў.[65] Прынцып 10 Дэкларацыі Рыа па навакольным асяроддзі і развіцці гаворыць:

> *Экалагічныя пытанні найбольш эфектыўна вырашаюцца пры ўдзеле ўсіх зацікаўленых грамадзян — на адпаведным узроўні. На нацыянальным узроўні кожны чалавек павінен мець адпаведны доступ да інфармацыі, якая тычыцца навакольнага асяроддзя і маецца ў распараджэнні дзяржаўных органаў,*

*уключаючы інфармацыю пра небяспечныя матэрыялы і дзейнасць ў яго/яе рэгіёне, і магчымасць удзельнічаць у працэсах прыняцця рашэнняў. Дзяржавы развіваюць і заахвочваюць інфармаванасць і ўдзел насельніцтва шляхам шырокай даступнасці інфармацыі. Забяспечваецца эфектыўная магчымасць выкарыстоўваць судовыя і адміністрацыйныя працэдуры.*

У прыватнасці, у 2001 годзе Орхуская канвенцыя падкрэсліла аспекты правоў чалавека па ахове навакольнага асяроддзя. Яна патрабуе, каб дзяржаўная ўлада праводзіла экалагічную інфармацыю ў інтарэсах грамадскасці, і накладае на дзяржавы-ўдзельніцы абавязак гарантаваць права на доступ да інфармацыі, удзел грамадскасці ў працэсе прыняцця рашэнняў і права на доступ да разгляду судом ці незалежным і бесстароннім органам, створаным законам за адмову ў прадастаўленні інфармацыі. Дзяржавы-ўдзельніцы павінны забяспечваць належнае прызнанне і падтрымку аб’яднанняў, арганізацый або груп, якія спрыяюць ахове навакольнага асяроддзя, і каб асобы, якія ажыццяўляюць гэтыя правы, не падвяргаліся пакаранню, пераследу або ўціску ў любой форме[66]. Беларусь ратыфікавала Орхускую канвенцыю 9 сакавіка 2000 года, яна ўступіла ў сілу 30 кастрычніка 2001 года. Аднак нягледзячы на ўрок аварыі на Чарнобыльскай АЭС, Беларусь парушыла свае абавязкі па Орхускай канвенцыі па спрыянні ўдзелу грамадскасці ў прыняцці экалагічных рашэнняў. На сустрэчы дзяржаў-удзельніц канвенцыі ў Кішынёве (Малдова) у чэрвені-ліпені 2011 года, удзельнікі адзначылі, што Беларусь не кансультавала і не інфармавала грамадскасць адносна двух праектаў са значным уплывам на навакольнае асяроддзе – гідраэлектрастанцыіна рацэ Нёман і АЭС у Астраўцы.

## 7.1 АСТРАВЕЦКАЯ АЭС




© Сяргей Ягела

У 2007 годзе было прынята рашэнне пабудаваць атамную электрастанцыю ў Астраўцы. Указ Прэзідэнта № 565 “Аб некаторых мерах па будаўніцтве атамнай электрастанцыі” ад 12 лістапада 2007 года стварыў Упраўленне па будаўніцтве АЭС. Было вырашана размясціць электрастанцыю ў Астраўцы – гэта вёска ў сельскай мясцовасці на літоўскай мяжы, якая славіцца сваёй прыроднай прыгажосцю. Таццяна Новікава з прыродаахоўнай арганізацыі “Экадом” прыняла ўдзел у грамадскіх слуханнях, арганізаваных Упраўленнем 9 кастрычніка 2009 года:

> *“Слуханні па праекце былі праведзены ў Астраўцы ў 180 км ад Мінска. Туды было цяжка дабрацца, і на шляху туды многіх спыніла дарожная міліцыя па няпэўных прычынах і затрымала на гадзіну ці дзве. Мы ехалі па вясковай дарозе і дабраліся да Астраўца, але калі мы спрабавалі ўвайсці ў залу, нам сказалі, што няма месцаў. У пакоі было шмат працаўнікоў завода і людзей з Упраўлення. Яны прыехалі на аўтобусах за гадзіну да пачатку”.*[67]

На момант праведзення грамадскіх слуханняў, работы па развіцці атамнай электрастанцыі вяліся некалькі год – з 2007 года. Распрацоўшчыкі зрабілі ацэнку яго ўздзеяння на навакольнае асяроддзе. З яе вынікамі можна было азнаёміцца ў іх офісе ў Мінску, але нельга зрабіць копію.

На пасяджэнні Камітэта па выкананні Орхускай канвенцыі ў ходзе сустрэчы дзяржаў-удзельніц у Кішынёве ў чэрвені-ліпені 2011 года Камітэт выявіў, што кансультацыі з грамадскасцю па АЭС у Атраўцы было недастаткова, таму што грамадскасць не была ўцягнута ў рашэнне будаваць АЭС ці не, і можна было толькі абмеркаваць, як змякчыць магчымыя экалагічныя наступствы, таму што грамадскасць не атрымала адпаведны доступ да даклада па ацэнкы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе. Акрамя таго, працэс кансультацый быў арганізаваны распрацоўшчыкам – зацікаўленым бокам, што няправільна.

Экалагічныя актывісты, якія спрабавалі прыняць удзел у публічных слуханнях і пасля распавесці аб праблемах, былі падвергнутыя адміністрацыйным затрыманням і канфіскацыі іх інфармацыйных матэрыялаў, што парушыла іх правы на свабоду мірных сходаў і свабоду выказвання.

### 7.1.1 АДМІНІСТРАЦЫЙНЫЯ ЗАТРЫМАННІ

9 кастрычніка 2009 года Андрэй Ажароўскі, эксперт па навакольным асяроддзі з Расіі, быў затрыманы, калі ён наведваў публічныя слуханні ў Астраўцы. Міліцыя абвінавaціла яго ў дробным хуліганстве – у парушэнні грамадскага парадку, якое складалася з таго, што ён нібыта крычаў і размахваў рукамі. Мясцовая міліцыя дапытвала яго на працягу чатырох гадзін, сем дзён ён правёў у зняволенні, калі спрабаваў увайсці на сустрэчу з буклетамі аб праекце.

> *“Хтосьці з аргкамітэта выйшаў і сказаў: “Вы не можаце пайсці з матэрыяламі, але без іх, калі ласка, гэта ваша права”. У мяне не было вялікага выбару, таму я пакінуў пакет і рушыў услед за ім у памяшканне. Я зрабіў толькі некалькі крокаў, калі я пачуў загад: “Узяць яго!” Мая правая рука была закручана, мяне адвялі ў сіні фургон. Яны крычалі “Сядзі ціха! Рукі на калені! Не рухацца”. Я сядзеў. Што яшчэ я мог зрабіць? Іх было восем”.*[68]

Нягледзячы на тое, што ён загадзя сказаў пра свой намер прысутнічаць на слуханні, Андрэй Ажароўскі першапачаткова быў пазбаўлены арганізатарамі магчымасці наведаць сустрэчу. Калі ён прыбыў, яму сказалі, што пропуск на сустрэчу ажыццяўляецца толькі па запрашэннях, яго і іншых экалагічных актывістаў запусцілі ў апошні момант, калі памяшканне было абвешчана запоўненым.

18 Ліпеня 2012 года Андрэй Ажароўскі быў ізноў затрыманы разам з Мікалаем

Мацкевічам, Ірынай Сухі і Таццянай Новікавай з арганізацыі “Экадом”, калі яны ішлі, каб перадаць ліст у амбасаду Расіі ў Мінску з нагоды візіту Дзмітрыя Мядзведзева, прэм’ер-міністра Расіі, для падпісання кантракта на будаўніцтва АЭС.

Таццяна Новікава і Андрэй Ажароўскі разам працавалі над напісаннем ліста ў яе дома і проста выходзілі з будынка, калі да іх падышлі супрацоўнікі праваахоўных органаў, якія сцвярджалі, што яны выглядалі як асабліва небяспечныя злачынцы, якія ў гэтым раёне праводзілі крадзяжы. Супрацоўнікі забралі іх пашпарты і настойвалі, каб Таццяна Новікава і Андрэй Ажароўскі разам з імі прайшлі ў аддзяленне міліцыі. Калі яны спыталі, што б здарылася, калі б яны адмовіліся, супрацоўнікі міліцыі сказалі ім, што выкарысталі б сілу. Яны былі дастаўлены ў аддзяленне міліцыі Маскоўскага раёна горада Мінска, дзе іх пашпарты і рэчы былі канфіскаваны, і ім сказалі, што яны абвінавачаны ў дробным хуліганстве за брыдкаслоўе ў грамадскім месцы па артыкуле 17.1 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. Праз некалькі гадзін яны былі асуджаны. Таццяна Новікава расказала “Міжнароднай Амністыі”, што судовы працэс доўжыўся ўсяго паўтары хвіліны. Таццяна Новікава была асуджана да арышту на пяць дзён, Андрэй Ажароўскі атрымаў 10 сутак зняволення за тое ж правапарушэнне. Таццяна Новікава так апісала ўмовы, у якіх яна знаходзілася падчас яе ўтрымання пад вартай:

> *“Тры дні я спала на дошках без матраца, у цалкам халоднай і сырой камеры, для мяне гэта было даволі цяжка. Умовы, у якіх тут знаходзяцца людзі, з’яўляюцца бесчалавечнымі. Ім не даюць пасцельных рэчаў, яны спяць у клетцы, дзе ёсць невялікі драўляны памост і дзе можна схіліць галаву, але так спаць немагчыма. Там быў адкрыты туалет, у выніку чаго ўся клетка смярдзела, і зняволеныя павінны былі плаціць 5 еўра ў дзень за харчаванне, за выключэннем хлеба і вады, якія даваліся бясплатна”.*[69]

29 ліпеня Андрэй Ажароўскі быў дэпартаваны ў Расію, яму быў забаронены ўезд у Беларусь на працягу 10 гадоў.

### 7.1.2 АБМЕЖАВАННІ НА СВАБОДУ ПЕРАМЯШЧЭННЯ Ў ЕЎРАПЕЙСКІ САЮЗ

У верасні 2012 года Таццяне Новікавай і Мікалаю Уласевічу, каардынатару Беларускай антыядзернай кампаніі, было адмоўлена ва ўездзе ў Літву. Яны былі запрошаны на канферэнцыю па ядзернай энергетыцы ў літоўскім парламенце, якая была арганізавана Кансерватыўнай партыяй. Літоўскія памежнікі сказалі ім, што яны патрапілі ў чорны спіс Міністэрства замежных спраў Літвы, таму што яны ўяўлялі небяспеку для нацыянальнай бяспекі Літвы і іншых краін ЕС. У кастрычніку 2012 года яны абскардзілі гэтае рашэнне ў судзе Літвы. У студзені забарона на паездкі ў дачыненні да Мікалая Уласевіч была адменена, а для Таццяны Новікавай яна была адменена 18 сакавіка 2013 года. Калі ён спытаў пра прычыны забароны, суддзя паведаміў Мікалаю Уласевічу, што прычынай з’яўляўся дзяржаўны сакрэт.

“Міжнародная Амністыя” заклікае беларускія ўлады выконваць свае абавязкі ў якасці дзяржавы-ўдзельніка Орхускай канвенцыі для забеспячэння права на доступ да інфармацыі, удзелу грамадскасці ў працэсе прыняцця рашэнняў і права на доступ да разгляду судом ці незалежным і бесстаронннім органам, заснаваным законам, адмовы ў прадастаўленні інфармацыі. Беларусь мае абавязкі не толькі для падтрымкі

аб’яднанняў, арганізацый або груп, якія спрыяюць ахове навакольнага асяроддзя, але і для таго, каб людзі, якія ажыццяўляюць гэтыя правы, не падвяргаліся пакаранню, пераследу або ўціску ў любой форме.

Арганізацыя таксама заклікае беларускія ўлады расследаваць адміністрацыйнае затрыманне Андрэя Ажароўскага і Таццяны Новікавай, якія, падобна, былі затрыманы ў парушэнне іх права на свабоду сходаў у ліпені 2012 года. Калі будзе ўстаноўлена, што яны былі адвольна затрыманы, ім павінна быць прапанавана кампенсацыя ў адпаведнасці з абавязкамі Беларусі і з артыкулам 9 (5) МПГПП.

# 8. ЛГБТ-ГРУПЫ

Беларусь стала трэцяй рэспублікай былога СССР, якая адмяніла крымінальнае пакаранне за гомасэксуальнасць у 1994 годзе, аднак, не было ніякіх іншых намаганняў, каб пераканацца, што заканадаўства абараняе правы лезбіянак, геяў, бісэксуалаў і трансгендэраў (ЛГБТ) у Беларусі. Яны сутыкаюцца з вельмі высокім узроўнем негатыўных стэрэатыпаў і сацыяльных забабонаў, як і ў іншых постсавецкіх грамадствах, і гэтыя адносіны падтрымліваюцца на самым высокім узроўні Прэзідэнтам Лукашэнкам. У сакавіку 2012 года пасля заявы міністра замежных спраў Германіі Гіда Вестэрвеле, які тлумачыў, што Германія адклікае свайго амбасадара ў знак пратэсту супраць парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі, Лукашэнка адказаў: “Калі я пачуў яго – кім бы ён ні быў, геем або лесбіянкай – як ён кажа пра дыктатуру, я думаў – лепш быць дыктатарам, чым геям”.[70]

Згодна з міжнародным правам Беларусь абавязана забяспечыць, каб кожны мог ажыццяўляць свае правы чалавека на свабоду выказвання меркавання, мірных сходаў і аб’яднанняў, а таксама ўсе іншыя правы, без якой-небудзь дыскрымінацыі па прыкмеце гендэрнай ідэнтычнасці ці сексуальнай арыентацыі.

## 8.1 АБМЕЖАВАННЕ СВАБОДЫ МІРНЫХ СХОДАЎ

“Міжнародная Амністыя” задакументавала парушэнні права на свабоду мірных сходаў актывістаў ЛГБТ на працягу многіх гадоў:

### ЗАБАРОНА МІНСКАГА ГЕЙ-ПРАЙДА

У 2008 годзе ЛГБТ-актывісты ў Гомелі і Мінску запыталі дазвол на правядзенне невялікіх вулічных акцый на 4 і 10 мая адпаведна, каб адсвяткаваць Славянскі гей-прайд, але ў іх правядзенні было адмоўлена адпаведнымі гарадскімі адміністрацыямі. Мінскім актывістам сказалі, што іх дзеянне будзе блакаваць праезд. Гомельскім актывістам - што яны не даказалі, што будуць забяспечваць адэкватную медыцынскую дапамогу на мерапрыемстве, або што будуць прыбіраць потым, хоць яны прадэманстравалі гэта ў сваёй заяве.

12 лютага 2009 года заяўка групы з 20 чалавек для правядзення невялікіх грамадскіх дзеянняў дасведчанасці аб праблемах ЛГБТ была адмоўлена адміністрацыяй горада Гомеля. Яны сказалі, што заяўка не ўключала копіі дагавораў з мясцовым аддзяленнем міліцыі, паліклінікай і службай уборкі па забеспячэнні грамадскага парадку, бяспекі і ўборкі пасля акцыі. Суд Гомельскага раёна пастанавіў, што заяўка была адхілена ў адпаведнасці з Законам аб масавых мерапрыемствах і адхіліў апеляцыю.

8 мая 2010 года Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт не даў дазвол на марш, каб адсвяткаваць Славянскі гей-прайд 15 мая, таму што прапанаваны маршрут быў у межах 200 м ад станцый метро і пешаходных пераходаў. Група дэманстрантаў арганізавала мірнае шэсце 15 мая, нягледзячы на забарону. 7 дэманстрантаў правялі выходныя пад вартай, яшчэ пяцёра актывістаў былі затрыманы на тры гадзіны, сярод іх арганізатар Славянскага гей-прайда ў Мінску Сяргей

Андросенка.

У кастрычніку 2011 года заяўка на правядзенне маршу ў гонар Мінскага гей-прайда 22 кастрычніка на ўскраіне Мінска была адхілена Мінскім гарадскім саветам дэпутатаў на той падставе, што марш прайшоў бы ў 50 метрах ад грамадскіх будынкаў. Зварот да суда Маскоўскага раёна Мінска ў снежні быў таксама адхілены.

У кастрычніку 2012 года заяўка на правядзенне марша Мінскага гей-прайда была адхілена на той падставе, што мясцовая ўлада плануе мерапрыемства ў той жа час і на тым жа месцы. Тым не менш, актывісты змаглі паспяхова наняць трамвай, і 11 кастрычніка правялі акцыю ЛГБТ у трамваі.

## 8.2 АБМЕЖАВАННЕ СВАБОДЫ АСАЦЫЯЦЫЙ – АДМОВА Ў РЭГІСТРАЦЫІ ЛГБТ-АРГАНІЗАЦЫІ

> *“Гэта было больш падобна на спецаперацыю супраць злачынцаў. Вядома, гэтая акцыя была прызначана для застрашвання і запалохвання тых, хто адважыўся публічна заявіць аб сваёй гомасексуальнасці ў Беларусі”.*
> Сяргей Андросенка, каардынатар “Гей-Беларусь”.[71]

У цяперашні час у Беларусі няма зарэгістраваных ЛГБТ-арганізацый. У 2011 годзе арганізацыя “Гей-Беларусь” спрабавала зарэгістравацца пад імем “Альтэрнатыва Плюс”. Заяўка была адхілена Міністэрствам юстыцыі 19 снежня 2011 года на той падставе, што дадзеныя некаторых з заснавальнікаў арганізацыі былі пададзены з памылкамі (ня правільна паказана імя або прозвішча заснавальніка, нумар кватэры заснавальніка). Міністэрства юстыцыі выявіла недакладнасці ў адрасе аднаго заснавальніка з Гродна, напісанні імя другога і ў даце нараджэння трэцяга. У снежні 2012 года “Гей-Беларусь” зноў падала заяўку на рэгістрацыю, на гэты раз на рэгістрацыю пад назвай Рэспубліканскае маладзёжнае грамадскае аб'яднанне “Праваабарончы цэнтр “Лямбда”. Міністэрства юстыцыі адмовіла ў рэгістрацыі ў лютым 2013 года. На гэты раз прычынай стала тое, што арганізацыя не ўключыла ў статут дзейнасць па “падтрымцы сацыяльнай сталасці і ўсебаковага развіцця беларускай моладзі”.

адмовіла ёй у рэгістрацыі на той падставе, што дадзеныя некаторых з заснавальнікаў арганізацыі былі пададзены з памылкамі (ня правільна паказана імя або прозвішча заснавальніка, нумар кватэры заснавальніка). Міністэрства юстыцыі выявіла недакладнасці ў адрасе аднаго заснавальніка з Гродна, напісанні імя другога і ў даце нараджэння трэцяга.

Пасля заяўкі на рэгістрацыю праваабарончага цэнтра “Лямбда” ў снежні 2012 года ЛГБТ-актывісты былі падвергнуты серыі міліцэйскіх рэйдаў і праверак, якія ўключалі выпадкі жорсткага абыходжання. Сяргей Андросенка, каардынатар “Гей-Беларусь”, распавёў “Міжнароднай Амністыі”, што ён лічыць, што гэтыя рэйды і праверкі былі звязаны са спробай зарэгістраваць арганізацыю. У ноч з 11 па 12 студзеня 2013 года супрацоўнікі міліцыі ўвайшлі ў мінскі клуб «6А», дзе адбывалася вечарынка ЛГБТ. Яны заблакавалі выхад, апыталі ўсіх у клубе і праверылі іх дакументы. Міліцыя

сцвярджала, што шукала збеглага злачынцу. На наступную ноч аналагічны інцыдэнт адбыўся ў Віцебску ў клубе 21st Century Club. Каля 11 гадзін вечара два дзяжурных міліцыянера ўвайшлі і сказалі, што яны ведаюць, што ў клубе адбываюцца "дзеянні сексуальных меншасцяў". Яны на працягу гадзіны глядзелі, што адбываецца ў клубе, а потым сышлі. Праз паўгадзіны ўвайшла група міліцыі і атрад спецыяльнага прызначэння. Яны адразу ж загадалі ўсім стаць тварам да сцяны – мужчыны да адной сцяны і жанчыны да іншай. Яны запісалі звесткі аб усіх і ўсё здымалі. Сяргей Андросенка распавёў "Міжнароднай Амністыі": "Яны былі даволі жорсткімі да хлапцоў. Яны казалі гамафобныя жарты і некаторыя непрыстойныя параўнанні".[72]

Пасля гэтых падзей больш 60 чалавек, чые імёны былі ў спісе членаў-заснавальнікаў праваабарончага цэнтра "Лямбда", былі запрошаны на допыт у Упраўленніе па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі людзьмі Міністэрства Унутраных Спраў ў 10 розных гарадах. Яны былі выкліканы на допыт у сувязі з рознымі злачынствамі, уключаючы незаконны абарот наркотыкаў і згвалтаванне, але, па словах Сяргея Андросенкі, пытанні не былі звязаны з меркаванымі злачынствамі, а з сексуальнай актыўнасцю членаў-заснавальнікаў і дзейнасцю арганізацыі. У многіх выпадках міліцыя прыбывала на месца працы ці тэлефанавала сваякам, выклікаючы збянтэжанасць.

Нарэшце, 19 студзеня 2013 года Сяргей Андросенка вяртаўся з Польшчы ў Беларусь і быў спынены ў Брэсце. Яму сказалі, што насупраць яго імені стаіць крыж, таму што ёсць інфармацыя, што яго пашпарт быў скрадзены. Калі Сяргей Андросенка паказаў свой пашпарт, яму дазволілі прайсці і сказалі, што, верагодна, адбылася памылка. Па вяртанні ў Беларусь, аднак, яго пашпарт быў канфіскаваны, а яму сказалі, што яго пашпарт быў ануляваны ў Мінску.

## ІГАР ЦІХАНЮК

*“Я не хачу хаваць сябе. Я жыву адкрыта. Гэта не лёгка ў Беларусі, але я хачу паказаць людзям, што я чалавек, як і ўсе. Можа быць, з дапамогай майго прыкладу я хачу паказаць, што можна жыць адкрыта”.*



© Сяргей Ягела

Ігар Ціханюк, які адкрыта прызнае сябе геем, быў адным з дапытаных міліцыяй пасля спробы зарэгістраваць праваабарончы цэнтр “Лямбда” ў студзені 2013 года. Яго трымалі ў міліцэйскім участку на працягу адной гадзіны, збівалі і падвяргалі пагрозам і злоўжыванням за тое, што ён гей, перш чым адпусціць без прад’яўлення абвінавачвання. Ён распавёў “Міжнароднай Амністыі”, што ён праходзіў лячэнне язвы страўніка ў бальніцы ў Гродна, калі 6 лютага 2013 года 2 міліцыянеры ў цывільным ўвайшлі ў бальнічную палату і папрасілі яго паехаць з імі ў аддзел міліцыі Кастрычніцкага раёна. Ён быў дастаўлены на трэці паверх аддзялення, дзе міліцыянеры сур’ёзна спыталіся пра мадэль яго мабільнага тэлефона, аўтамабіль і абутак. Не разумеючы прычын такіх пытанняў, Ігар Ціханюк адмовіўся адказваць. Ён пагадзіўся, каб нахіліцца і высветліць марку яго абутку, і ў гэты момант ён атрымаў удар у грудзі і ўпаў. Яго папрасілі ўстаць, і ў гэты момант яго зноў ўдарылі ў агульнай складанасці шэсць разоў. Супрацоўнікі міліцыі выйшлі з пакоя, затым увайшлі два іншых міліцыянеры і спыталі, што ён рабіў у Мінску ў снежні 2012 года, калі ён адправіўся на пасяджэнне “Гей-Беларусь”. Ігар Ціханюк адмовіўся адказваць, а затым жанчына-міліцыянер увайшла і, ведаючы Ігара Ціханюка, яна пачала пракруткі яго фатаграфій у жаночай адзежы, якія былі на яго мабільным тэлефоне, і паказала міліцыянеру, які затым стаў здзекавацца з яго за тое, што ён гей, і пагражаў гвалтам. Кіраўнік аддзялення, дзе Ігар потым лячыўся, патэлефанаваў у міліцэйскі ўчастак і запатрабаваў, каб яго адправілі назад у бальніцу. Міліцыянеры адпусцілі яго і адвезлі назад у бальніцу. Ігар Ціханюк скардзіўся на жорсткае абыходжанне ў міліцэйскім участку, 13 сакавіка пракуратура паведаміла яму, што доказаў недастаткова, каб пачаць расследаванне. Ён абскардзіў гэтае рашэнне, і чакае адказу на момант напісання гэтага тэксту.[73]

“Міжнародная Амністыя” заклікае ўрад Беларусі паважаць права на свабоду сходаў членаў ЛГБТ. Арганізацыя таксама заклікае ўрад Беларусі паважаць права на свабоду аб’яднанняў ЛГБТ, даючы ім магчымасць зарэгістраваць Праваабарончы цэнтр “Лямбда”. “Міжнародная Амністыя” нагадвае ўладам, што ў якасці дзяржавы-ўдзельніцы МПГПП Беларусь мае абавязкі паважаць і забяспечваць правы ўсіх людзей на яе тэрыторыі без дыскрымінацыі па якім-небудзь з падстаў, забароненых міжнародным правам, у тым ліку гендэрнай ідэнтычнасці і сексуальнай арыентацыі.

Акрамя таго, як дзяржава-ўдзельніца Канвенцыі ААН супраць катаванняў, Беларусь абавязана прадухіляць катаванні і іншыя віды жорсткага, бесчалавечнага абыходжання, якое прыніжае чалавечую годнасць; Беларусь павінна забяспечыць, каб паведамленні пра такія выпадкі аператыўна, старанна і справядліва расследаваліся. “Міжнародная Амністыя” заклікае ўлады забяспечыць неадкладнае, дбайнае, незалежнае і бесстароннее расследаванне сведчанняў Ігара Ціханюка, што ён быў збіты супрацоўнікамі міліцыі і падвяргаўся пераследу з-за сваёй сексуальнай арыентацыі. Адказныя службовыя асобы павінны падвергнуцца дысцыплінарнарнай ці крымінальнай адказнасці па меры неабходнасці.

# 9. ВЫСНОВЫ І РЭКАМЕНДАЦЫІ

Беларускія ўлады законамі і практыкай сур’ёзна абмяжоўваюць свабоду мірных сходаў і аб’яднанняў. Прыватныя асобы і НДА не маюць магчымасці дапамагаць групам у іх грамадстве і ўносіць пазітыўны ўклад у свае супольнасці і ў палітыку ўрада ў цэлым. “Міжнародная Амністыя” заклікае ўрад Беларусі ўнесці наступныя змены ў заканадаўства і забяспечыць, каб службовыя асобы ўжывалі заканадаўства такім чынам, каб аблегчыць свабоду мірных сходаў і аб’яднанняў. Праводзячы гэтыя змены, беларускі ўрад дапаможа раскрыць патэнцыял беларускай грамадзянскай супольнасці.

## 9.1 БЕЛАРУСКІМ УЛАДАМ

“Міжнародная Амністыя” заклікае ўсіх беларускіх чыноўнікаў, у тым ліку Прэзідэнта, генеральнага пракурора, міністра ўнутраных спраў і міністра юстыцыі:

- забяспечыць укараненне ў практыку ўсіх абавязкаў Беларусі ў галіне міжнародных правоў чалавека, у тым ліку МПГПП, Канвенцыі МАП аб свабодзе аб’яднанняў і абароне права на арганізацыю, Канвенцыі МАП аб праве на арганізацыю і на вядзенне калектыўных перамоваў і Орхускай канвенцыі, а таксама выконваць прынцыпы Дэкларацыі ААН аб праваабаронцах;

- паважаць і забяспечваць правы ўсіх асоб на сваёй тэрыторыі без дыскрымінацыі па якім-небудзь падставах, забароненых міжнародным правам, у тым ліку гендарнай дыскрымінацыі;

- выконваць рашэнні Камітэта ААН па правах чалавека, дзе ён знайшоў парушэнні свабоды аб’яднанняў, выказвання меркавання і сходаў, і забяспечыць пакрыццё шкоды, у тым ліку вяртанне канфіскаванай маёмасці і кампенсацыю ў выпадку неабходнасці;

- супрацоўнічаць з іншымі органамі ААН, уключаючы Спецыяльнага дакладчыка па Беларусі;

- спыніць выкарыстанне крымінальнага закона такім чынам, каб заглушыць крытыку органаў дзяржаўнай улады або запалохаць тых, хто выказвае сваё мірнае іншадумства;

- пераканацца, што мірныя дэманстранты не трапляюць у турму, не падвяргаюцца пераследу і жорсткаму абыходжанню з боку міліцыі за ажыццяўленне свайго права на свабоду выказвання, свабоду мірных сходаў і аб’яднанняў;

- пакласці канец практыцы прамой ці ўскоснай перашкоды, пераследу і запалохвання няўрадавых арганізацый, якія займаюцца заахвочваннем і абаронай правоў чалавека ў Беларусі, у тым ліку прафсаюзаў, экалагічных груп, ЛГБТ-груп і праваабарончых груп;

- неадкладна і безумоўна вызваліць усіх тых, хто быў затрыманы выключна за мірнае выказванне сваіх палітычных ці іншых перакананняў і за сексуальную арыентацыю.

## Свабода асацыяцый

“Міжнародная Амністыя” заклікае беларускія ўлады перагледзець прэзідэнцкія ўказы і законы, якія адносяцца да рэгістрацыі і дзейнасці няўрадавых арганізацый, у мэтах забеспячэння эфектыўнага ажыццяўлення права на свабоду аб’яднанняў у адпаведнасці з абавязкамі Беларусі ў галіне міжнародных правоў чалавека. У прыватнасці:

- неадкладна адмяніць артыкул 193-1 Крымінальнага кодэкса;

- змяніць патрабаванне для НДА па забеспячэнні юрыдычнага адраса, каб ім не адмаўлялі ў рэгістрацыі, таму што яны не могуць атрымаць юрыдычны адрас;

- адмяніць адміністрацыйную забарону і крымінальную адказнасць за атрыманне замежных грантаў;

- зняць забарону для НДА захоўваць сродкі ў банках за мяжой;

- забяспечыць, каб існуючыя законы прымяняліся такім чынам, што забяспечвае і палягчае ажыццяўленне права на свабоду аб’яднанняў і сходаў, а не перашкаджае гэтаму, шляхам навучання асоб, адказных за рэгістрацыю і кантроль за дзейнасцю НДА, каб яны былі цалкам інфармаваны аб адпаведным беларускім заканадаўстве і міжнародных абавязках па забеспячэнні права на свабоду аб’яднанняў і сходаў.

## Свабода сходаў

“Міжнародная Амністыя” заклікае беларускія ўлады перагледзець прэзідэнцкія ўказы і законы, якія адносяцца да публічных мерапрыемстваў для забеспячэння эфектыўнага ажыццяўлення права на свабоду мірных сходаў у адпаведнасці з абавязкамі Беларусі у галіне міжнародных правоў чалавека. У прыватнасці:

- зрабіць наступныя папраўкі ў закон аб масавых мерапрыемствах:
  - змяншэнне абмежаванняў на месца правядзення сходаў да толькі тых, якія ў дадзеным выпадку з’яўляюцца відавочна неабходнымі для дапушчальнай мэты, прызнанай у міжнародным праве ў галіне правоў чалавека;
  - адмена патрабавання для арганізатараў забяспечваць абслугоўванне сходаў;
  - адмена шырокіх абмежаванняў на тых, хто можа арганізоўваць сходы;
  - адмена патрабавання паведамляць пра фінансавыя крыніцы падзеі;
  - адмена артыкула 15 закона аб масавых мерапрыемствах, які прадугледжвае ліквідацыю любой арганізацыі, якая не выконвае гэты закон;
  - з вызначэння пікетаў выключыць дзеянні адзіночак.

- забяспечыць, каб міліцыя дзейнічала ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі праваахоўных органаў у дачыненні да дэманстрацый і пазбягала прымянення сілы або, калі гэта немагчыма, абмяжоўвала такое прымяненне да неабходнага мінімуму;

- забяспечыць, каб усе сцвярджэнні аб непатрэбным або празмерным прымяненні сілы супрацоўнікамі праваахоўных органаў расследаваліся аператыўна і

справядліва, а вінаватыя неслі адпаведную дысцыплінарную і крымінальную адказнасць. Любы супрацоўнік праваахоўных органаў, які абгрунтавана падазраецца ў адвольным або наўмысным прымяненні сілы, павінен быць прыцягнуты да адказнасці ў судовым парадку, які адпавядае міжнародным стандартам справядлівага судовага разбору са штрафамі, супамернымі цяжару злачынства, не звяртаючыся да смяротнага пакарання. Ахвярам незаконнага прымянення сілы супрацоўнікамі праваахоўных органаў, незалежна ад таго, вызначаны вінаватыя або пераследуюцца судовым парадкам, павінна быць забяспечана пакрыццё шкоды, уключаючы кампенсацыю.

## 9.2 ДА МІЖНАРОДНАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

“Міжнародная Амністыя” заклікае адпаведных членаў міжнароднай супольнасці, у прыватнасці Еўрапейскі саюз і АБСЕ:

### Да Еўрапейскага саюза:

- заклікаць Беларусь унесці неабходныя змены ў заканадаўства для забеспячэння эфектыўнага ажыццяўлення права на свабоду мірных сходаў і аб’яднанняў;

- заклікаць Беларусь да рэалізацыі рашэння Камітэта ААН па правах чалавека, МАП і Орхускай канвенцыі;

- настойліваць на неадкладным і безумоўным вызваленні ўсіх вязняў сумлення ў Беларусі.

### Да АБСЕ:

- заклікаць Беларусь паважаць міжнародныя стандарты свабоды сходаў, у тым ліку стандарты АБСЕ.

# ЗНОСКІ

[1] Гл.: “Лукашэнка папярэдзіў бізнэс пра недапушчальнасць фінансавання апазіцыі”, Наша ніва, 26 лютага 2013, http://nn.by/?c=ar&i=105586&lang=ru

[2] Дакумент Chatham House, Orysia Lutsevych, How to Finish a Revolution: Civil Society and Democracy in Georgia, Moldova and Ukraine, студзень 2013, REP BP 2013/01, http://www.chathamhouse.org/sites/default/files/public/Research/Russia%20and%20Eurasia/0113bp_lutsevych.pdf

[3] Рэзалюцыя Савета ААН па правах чалавека 15/21, Правы на свабоду мірных сходаў і асацыяцый, 6 кастрычніка 2010, http://daccess-dds-ny.un.org/doc/UNDOC/GEN/G10/166/98/PDF/G1016698.pdf?OpenElement

[4] Даклад Спецыяльнага дакладчыка аб правах на свабоду мірных сходаў і асацыяцый, Майна Кяй (Maina Kiai), дваццатая сесія Савета ААН па правах чалавека, 21 мая 2012, параграф 56, стар. 14 http://www.ohchr.org/Documents/HRBodies/HRCouncil/RegularSession/Session20/A-HRC-20-27_en.pdf

[5] Гл. Заўвагі агульнага парадку Камітэта ААН па правах чалавека № 31, http://tb.ohchr.org/default.aspx?Symbol=CCPR/C/21/Rev.1/Add.13

[6] Гл. Заўвагі агульнага парадку Камітэта ААН па правах чалавека № 31, параграф 6, цытаваныя ў дакладзе Спецыяльнага дакладчыка аб правах на свабоду мірных сходаў і асацыяцый, Майна Кяй, дваццатая сесія Савета ААН па правах чалавека, 21 мая 2012, http://www.ohchr.org/Documents/HRBodies/HRCouncil/RegularSession/Session20/A-HRC-20-27_en.pdf, параграф 17

[7] Гл. Заўвагі агульнага парадку Камітэта ААН па правах чалавека № 27, параграф 13, http://www.unhchr.ch/tbs/doc.nsf/%28Symbol%29/6c76e1b8ee1710e380256824005a10a9?Opendocument

[8] Гл. Кіруючыя прынцыпах па свабодзе мірных сходаў АБСЕ, другое выданне, http://www.osce.org/odihr/73405?download=true, і БДІПЧ “Асноўныя рысы кіруючых прынцыпаў па свабодзе аб'яднанняў з акцэнтам на няўрадавых арганізацыях, http://www.osce.org/odihr/73405?download=true

[9] Гл. БДІПЧ “Асноўныя рысы кіруючых прынцыпаў па свабодзе аб'яднанняў з акцэнтам на няўрадавых арганізацыях, http://www.osce.org/odihr/73405?download=true

[10] Беларусь не з'яўляецца членам Савета Еўропы і не ратыфікавала Еўрапейскую канвенцыю па правах чалавека. Тым не менш, у той час як яго рашэнні не з'яўляюцца фармальна абавязковымі для Беларусі, яны ўключаюць стандарты, якія адлюстраўваюцца таксама і мноствам іншых арганізацый, такіх як Камітэт ААН па правах чалавека, АБСЕ і Спецыяльны дакладчыка па пытанні аб праве на свабоду сходаў і асацыяцый. Гл., напрыклад: справа Сандзі Таймс супраць Аб’яднанага Каралеўства (петыцыя № 6538/74.) Рашэнне ад 26 красавіка 1979, пункт. 59; справа EĞİTİM VE BİLİM EMEKÇİLERİ SENDİKASI супраць Турцыі (петыцыя № 20641/05), рашэнне ад25 верасня 2012 г., параграф 68.

[11] Гл. Заўвагі агульнага парадку Камітэта ААН па правах чалавека № 34, параграф 11, http://www2.ohchr.org/english/bodies/hrc/comments.htm

[12] Гл. справу Handyside супраць Аб'яднанага Каралеўства, http://hudoc.echr.coe.int/sites/eng/pages/search.aspx?i=001-57499#{%22itemid%22:[%22001-57499%22]}

[13] Гл. справу Handyside

[14] Гл. Заўвагі агульнага парадку Камітэта ААН па правах чалавека № 34, параграфы 18-19

[15] Дадзеныя Міністэрства юстыцыі прыведзены ў выданні "Свабода асацыяцыйі і прававы статус некамерцыйных арганізацый Беларусі. Штогадовы агляд 2012", Цэнтр прававой трансфармацыі, Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацый Беларусі, стар. 5, http://lawtrend.org/en/content/foundation/news/Annual-review-of-freedom-of-association-in-Belarus/

[16] Цэнтр прававой трансфармацыі, *Гражданское общество Беларуси становится спортивным*, 26 лютага 2013, http://lawtrend.org/ru/content/about/news/grazdanskoe-objestvo-belarus-stanovitsa-sportivnim/

[17] Інфармацыя Беларускай Хрысціянска-дэмакратычнай партыі.

[18] Прэзідэнцкі Дэкрэт №2 1999 г. "Аб некаторых мерах па ўпарадкаванні дзейнасці палітычных партый, прафесійных асацыяцый і іншых грамадскіх аб'яднанняў".

[19] Гл. Інтэрнет сайт Міністэрства юстыцыі: http://minjust.by/ru/site_menu/about/struktura/obschestv/registr/politpart

[20] 366[ы] Даклад Камітэта па свабодзе аб'яднанняў, МАП 316[ая] сесія, Жэнева, 1 – 16 лістапада 2012 г., http://www.ilo.org/wcmsp5/groups/public/---ed_norm/---relconf/documents/meetingdocument/wcms_193261.pdf

[21] "Свабода асацыяцыйі і прававы статус некамерцыйных арганізацый Беларусі. Штогадовы агляд 2012", Цэнтр прававой трансфармацыі, Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацый Беларусі, стар. 6, http://lawtrend.org/en/content/foundation/news/Annual-review-of-freedom-of-association-in-Belarus/

[22] Гл. Майна Кяй, параграфы 67-71.

[23] Гл. выданні "Свабода асацыяцыйі і прававы статус некамерцыйных арганізацый Беларусі. Штогадовы агляд 2012", Цэнтр прававой трансфармацыі, Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацый Беларусі, стар. 11, http://lawtrend.org/en/content/foundation/news/Annual-review-of-freedom-of-association-in-Belarus/

[24] Гл. Майна Кяй, стар.14, параграф 56.

[25] У большасці постсавецкіх краін дробныя правапарушэнні караюцца ў адпаведнасці з Адміністрацыйным кодэксам. У адпаведнасці з Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэннях у Беларусі пакаранні вар'ююцца ад штрафаў да пазбаўлення волі на 15 сутак.

[26] На момант падрыхтоўкі гэтага дакладу справа Змітра Дашкевіча зноў турбавала "Міжнародную Амністыю". Ён быў асуджаны да двух гадоў пазбаўлення волі ў сакавіку 2011 года ў сувязі з асноўным мірнай дэманстрацыяй у снежні 2010 года. Яго прысуд быў падоўжаны яшчэ на год ў жніўні 2012 года па абвінавачванні ў парушэнні турэмнага распарадку.

---

[27] Прадстаўнік “Міжнароднай Амністыі” прысутнічаў на працэсе Івана Шылы. Назіральнікі ад праваабарончых арганізацый і амбасад першапачаткова не дапускаліся на той падставе, што зала суда была поўная – мясцовым настаўнікам было даручана прысутнічаць на судзе, бо Іван быў непаўналетнім у той час. Але назіральнікаў прапусцілі пасля некаторых перамоваў. Іван Шыла настойліваў на вядзенні працэса на беларускай мове, і яму быў прадастаўлены пераклад кепскай якасці.

[28] Падрабязнасці справы не публікуюцца для абароны членаў царквы, якія асцерагаюцца таго, што публічнасць можа прывесці да рэпрэсій.

[29] Меркаванне аб сумяшчальнасці з універсальнымі стандартамі правоў чалавека артыкула 193.1 Крымінальнага кодэкса аб правах незарэгістраваных аб'яднанняў Рэспублікі Беларусь, прыняты Венецыянскай камісіяй на яе 88-й сесіі, Венецыя, 14 - 15 кастрычніка 2011, http://www.venice.coe.int/webforms/documents/?opinion=633&year=all

[30] Даклад Спецыяльнага дакладчыка аб правах на свабоду мірных сходаў і асацыяцый, Майна Кяй (Maina Kiai), дваццатая сесія Савета ААН па правах чалавека, 21 мая 2012, параграф 57-8, http://www.ohchr.org/Documents/HRBodies/HRCouncil/RegularSession/Session20/A-HRC-20-27_en.pdf

[31] Камітэт ААН па правах чалавека, петыцыя №. 1296/2004, разгледжана24 ліпеня2007, Алесь Бяляцкі супраць Беларусі, http://daccess-dds-ny.un.org/doc/UNDOC/DER/G07/434/87/PDF/G0743487.pdf

[32] Даклад Камітэта па правах чалавека, Том. 2, частка1, стар.42 http://www2.ohchr.org/english/bodies/hrc/docs/A.66.40_vol.II_partI.pdf

[33] Гл. Майна Кяй, стар.16, параграф 64.

[34] Цэнтр прававой трансфармацыі.

[35] Інтэрвью з Леанідам Скарабагатым, кіраўніком “Добрай волі”, 17 студзеня, 2012.

[36] Гл. Камітэт ААН па правах чалавека, петыцыя № 412/1990 Kivenmaa супраць Фінляндыы, пункты 7.6, Выбраныя Рашэнні Камітэта па правах чалавека ў адпаведнасці з Факультатыўным пратаколам, том 5, стар. 55, http://www.ohchr.org/Documents/Publications/SDecisionsVol5en.pdf

[37] Гл. Майна Кяй, параграф 26 і прынцыпы АБСЕ 2.1.

[38] Еўрапейская камісія за дэмакратыю праз права, Венецыянская камісія, з'яўляецца кансультатыўным органам Савета Еўропы па канстытуцыйных пытаннях. Яна была створана ў 1990 годзе і дае юрыдычныя кансультацыі краінам, а таксама супрацоўнічае з канстытуцыйнымі судамі і амбудсменаміі робіць транснацыянальныя даследаванні, даклады і семінары. У 2012 годзе камісія прадставіла сваё заключэнне па законе аб масавых мерапрыемствах: гл. Сумеснае заключэнне аб Законе аб масавых мерапрыемствах Рэспублікі Беларусь, 20 сакавіка 2012 г. http://legislationline.org/countries/country/42

[39] Гл. Майна Кяй, стар. 9 параграф 31, а таксама прынцыпы АБСЕ 5,2.

[40] Гл. Майна Кяй, стар. 9 параграф 29.

[41] Гл. Еўрапейскі суд па правах чалавека, Bukta і нш. супраць Венгрыі, http://hudoc.echr.coe.int/sites/eng/Pages/search.aspx#{%22fulltext%22:[%22Bukta%22],%22documentcollectionid%22:[%22COMMITTEE%22,%22DECISIONS%22,%22COMMUNICATEDCASES%22,%22C

LIN%22,%22ADVISORYOPINIONS%22,%22REPORTS%22,%22RESOLUTIONS%22]}

[42] Гл. Майна Кяй, параграф 91.

[43] Гл. спіс адміністрацыйных пакаранняў, складзены праваабарончым цэнтрам “Вясна”: http://spring96.org/persecution/?DateFrom=2012-01-01&DateTo=2012-12-31&Page=0

[44] На той час, у 2008 годзе, Антаніна Піванос атрымлівала месячную пенсію у памеры каля 400 000 беларускіх рублёў.

[45] Гл. Камітэт ААН па правах чалавека, петыцыя № 1830/2008, Антаніна Піванос супраць Беларусі, http://www.ccprcentre.org/wp-content/uploads/2012/12/18302008-Pivonos-v.-Belarus-en-.pdf

[46] Беларусь: Маўклівыя пратэсты палохаюць рэжым, 30 чэрвеня 2011 года, http://www.bbc.co.uk/news/world-europe-13975788

[47] Цытуецца з http://www.belta.by/ru/all_news/politics/Otdelnye-predstaviteli-oppozitsii-pytalis-zakupit-elektroshokery-i-petardy---KGB_i_535954.html

[48] http://www.unrol.org/files/basicp~3.pdf.

[49] Гл. Кіруючыя прынцыпах па свабодзе мірных сходаў АБСЕ, прынцып 5.7, http://www.osce.org/odihr/73405?download=true

[50] Гл. Майна Кяй, параграф 93.

[51] “Міжнародная Амністыя” задакументавала ціск, з якімі сутыкнуліся праваабарончыя арганізацыі адразу пасля дэманстрацыі ў снежні 2010 года, “Беларусь: "бяспека, мір і парадак" Парушэнні ў выніку выбараў у Беларусі”, 49/003/2011 EUR, 2 лютага 2011 года, http://www.amnesty.org/en/library/info/EUR49/003/2011/en

[52] Артыкул 15 новага закона аб КДБ, прынятага ў чэрвені 2012 года, дае паўнамоцтвы КДБ весці ўлік грамадзян якія падазраваліся ў здзяйсненні злачынстваў, http://www.kgb.by/okimitete/legaltexts/law04/

[53] Гл. артыкул на сайце Front Line Defenders, *Беларусь: Пераслед праaбаронцы Алега Воўчака*, 1 лістапада 2012 года, http://www.frontlinedefenders.org/node/20551

[54] Гл. http://spring96.org/ru/news/51510

[55] Інтэрвью з Аляксандрам Ярашуком, старшынём Беларускага Кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў, 30 студзеня 2013 года.

[56] МАП Даклад Камісіі па расследаванні, 2004 год, http://www.ilo.org/dyn/normlex/en/f?p=1000:50012:0::NO:50012:P50012_COMPLAINT_PROCEDURE_ID,P50012_LANG_CODE:2508289,en:NO

[57] Праз Агульную сістэму прэферэнцый ЕС краіны могуць атрымаць выгаду з мытных зніжак; таксама дадатковыя прэферэнцыі могуць быць прадастаўлены на спецыяльных умовах для ўстойлівага развіцця і належнага кіравання, калі краіна-бенефіцыяр з'яўляецца (эканамічна) саслабелай і выконвае пэўныя міжнародныя канвенцыі па правах чалавека, навакольным асяроддзі і прынцыпах кіравання.

[58] МАП Даклад Камісіі па расследаванні, 2004 год.

[59] Інтэрнет-сайт Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, http://www.fpb.by/ru/menu_left/about

[60] 366[ы] Даклад Камітэта па свабодзе аб'яднанняў, МАП 316[ая] сесія, Жэнева, 1 – 16 лістапада 2012 г., http://www.ilo.org/wcmsp5/groups/public/---ed_norm/---relconf/documents/meetingdocument/wcms_193261.pdf

[61] Інтэрвью з "Міжнароднай Амністыяй" , 15 скавіка 2013 года.

[62] Канстанцін Сумар: На "Граніце" незалежнага прафсаюзу ня будзе, RFE, 6 студзеня 2012 года, http://www.svaboda.org/content/article/24444110.html, а таксама інтэрвью з членамі незалежных прафсаюзаў 15 сакавіка2013 года.

[63] Гл. рэкамендацыі Камітэта, 366[ы] Даклад Камітэта па свабодзе аб'яднанняў, МАП.

[64] Спадчына Чарнобыля: медыцынскія, экалагічныя і сацыяльна-эканамічныя наступствы і рэкамендацыі ўрадам Беларусі, Расіі і Украіны, Чарнобыльскі форум: 2003–2005, стар. 40 http://www.iaea.org/Publications/Booklets/Chernobyl/chernobyl.pdf

[65] Дэкларацыі Канферэнцыі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па праблемах навакольнага асяроддзя чалавека (Стакгольмская дэкларацыя) http://www.unep.org/Documents.Multilingual/Default.asp?documentid=97&articleid=1503 і Дэкларацыя Рыа Аб навакольным асяроддзі і развіцці, http://www.unep.org/Documents.Multilingual/Default.asp?documentid=78&articleid=1163

[66] Канвенцыя аб доступе да інфармацыі, удзеле грамадскасці ў працэсе прыняцця рашэнняў і доступе да правасуддзя па пытаннях навакольнага асяроддзя, http://www.unece.org/fileadmin/DAM/env/pp/documents/cep43e.pdf

[67] Інтэрвью з Таццянай Новікавай, 8 сакавіка 2013 года

[68] http://www.bellona.ru/articles_ru/articles_2009/ozharovsky-aftermath

[69] Інтэрвью з Таццянай Новікавай, сакавік 2013 года

[70] http://www.spiegel.de/international/europe/better-to-be-a-dictator-than-gay-germany-slams-lukashenko-over-slur-a-819458.html

[71] http://www.guardian.co.uk/world/feedarticle/10660774

[72] Інтэрвью з Сяргеям Андросенкам, 23 студзеня 2013 года

[73] Інтэрвью з Ігарам Ціханюком, 18 сакавіка 2013 года

## ШТО НЕ ДАЗВОЛЕНА — ТОЕ ЗАБАРОНЕНА

### ГРАМАДЗЯНСКУЮ СУПОЛЬНАСЦЬ У БЕЛАРУСІ ПРЫМУШАЮЦЬ СЦІХНУЦЬ

У гэтым дакладзе аглядаецца стан правоў на свабоду мірных сходаў і асацыяцый у Беларусі і фіксуюцца парушэнні гэтых правоў у адносінах да праваабаронцаў, прафсаюзных і экалагічных актывістаў, а таксама лезбіянак, геяў, бісексуалаў і трансгендэраў.

Актывісты грамадзянскай супольнасці ў Беларусі пастаянна сутыкаюцца з бюракратычнымі перашкодамі, запалохваннямі і пераследам. Любая форма грамадскага дзеяння, нават пікет аднаго чалавека, патрабуе дазволу, які рэдка даецца, і мірным дэманстрантам пагражае штраф або турэмнае зняволенне. Чатыры чалавекі застаюцца ў турме і працоўных калоніях у сувязі з іх удзелам у асноўным мірнай дэманстрацыі ў снежні 2010 года.

Абмежавальнае заканадаўства і яго прымяненне пазбаўляе, людзей і НДА ў Беларусі магчымасці дапамагаць тым, хто ў нядолі, і ўносіць пазітыўны ўклад у сваю мясцовую грамаду, грамадства ў цэлым і ў дзяржаўную палітыку.

У дакладзе прыводзяцца рэкамендацыі па зменах заканадаўства і практыкі, якія могуць дапамагчы ўраду Беларусі выканаць свае міжнародныя абавязацельствы па правах чалавека, у прыватнасці, у дачыненні да забеспячэння права на свабоду мірных сходаў і асацыяцый.

amnesty.org

Індэкс: EUR 49/002/2013
красавік 2013

AMNESTY INTERNATIONAL